Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
Францішак БАГУШЭВІЧ

НАША СЛОВА

Штотыднёвая газета
(Выходзіць з сакавіка 1990 г.)

№ 39 (251)

27 верасня
1995 г.

Кошт — 500 рублёў

ПОСТУП ТЫДНЯ

○ **ПРАВАСЛАЎНАЯ ЦАРКВА БЕЛАРУСІ ПЕРАДАЛА** Святы Агонь ад гроба Госпадняга Каталіцкай царкве Беларусі.

○ ***У ГУТАРЦЫ З КАРЭСПАНДЭНТАМ «ЗВЯЗДЫ» ЛІДЭР БЕЛАРУСКАЙ САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫЧНАЙ ГРАМАДЫ МІКАЛАЙ СТАТКЕВІЧ СКАЗАЎ***: *«Мы вяртаемся да нашай партыйнай праграмы, якая нібыта заставалася, але яна была невядомая для насельніцтва на фоне ідэалогіі БНФ, пад крылом якога была БСДГ. Імідж БНФ у асноўным ідэалістычны, пры слове «БНФ» у простага чалавека ўсплываюць наступныя асацыяцыі: мова, гісторыя, антырасійскія настроі. Людзі ж галасуюць за сацыяльнае, і не трэба лічыць, што нацыя такая кепская... Мы ж цяпер вяртаемся да пазіцыі нармальнай сацыял-дэмакратычнай партыі, якая, бясспрэчна, застаецца патрыятычнай сілай».*

○ **З ДРУКУ СТАЛА ВЯДОМА,** што былы старшыня праўлення Нацыянальнага банка Станіслаў Багданкевіч заявіў кіраўніцтву Аб'яднана-дэмакратычнай партыі Беларусі аб афіцыйным сваім уступленні ў іх партыю пасля аб'яднальнага з'езда АДПБ і Грамадзянскай партыі.

○ ***75 ГАДОЎ НАЗАД*** *у Менску спектаклем «Рысь» (паводле аповесці Э.Ажэшкі «У зімовы вечар») адкрыўся Беларускі дзяржаўны драматычны тэатр (з 1926 года — БДТ-1, з 1944 года — імя Янкі Купалы, з 1965-га — акадэмічны, з 1993-га — Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы).*

○ **УТВОРАНА ЯШЧЭ АДНА (ПАСЛЯ СДС) КААЛІЦЫЯ ПАРТЫЙ — «АДЗІНСТВА»**, якая, верагодна, будзе зарэгістравана як выбарчы блок у Цэнтрвыбаркаме і будзе ўдзельнічаць у парламенцкіх выбарах у якасці адной палітычнай сілы. У гэты блок увайшлі Беларуская народная партыя, Беларуская нацыянальная партыя, Беларуская хрысціянска-дэмакратычная злучнасць і Хрысціянска-дэмакратычны выбар. Вышэйшым органам утворанай кааліцыі з'яўляецца палітычная рада, у якой будуць па тры прадстаўнікі ад кожнай партыі.

○ ***НАЦБАНК БЕЛАРУСІ ЎВЁЎ У ЗВАРОТ*** *банкноту у 50 000 рублёў. «Пагоні» на ёй няма. Затое ёсць пяцікутная зорка карычневага колеру.*

○ **БЕЛАРУСКІ КАМІТЭТ МІРУ ВЫСТУПІЎ З ІНІЦЫЯТЫВАЙ** аб абвяшчэнні 1996 года Годам чарнобыльскай трагедыі. Паколькі ў будучым годзе спаўняецца 10 гадоў з дня трагедыі, старшыня камітэта Іван Кірычэнка спадзяецца, што ініцыятыва будзе падтрымана ў першую чаргу ўрадам нашай краіны.

○ ***СУПРАЦОЎНІК ПРЭС-ГРУПЫ ЎПРАЎЛЕННЯ КДБ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА МАГІЛЁЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ СЯРГЕЙ БАГДАНОВІЧ У ГУТАРЦЫ З КАРЭСПАНДЭНТАМ «МАГІЛЁЎСКІХ ВЕДАМАСЦЯЎ» ПАВЕДАМІЎ,*** *што пошукі крыжа Ефрасінні Полацкай далі пэўны плён. Па адной з версій крыж і не пакідаў Магілёў, а па другой — крыж разам з іншымі каштоўнасцямі быў эвакуіраваны ў Расію.*

«Беларускі кнігазбор»

11 верасня ў канферэнц-зале Дома літаратара адбылася прэзентацыя серыі кніг Беларускага інстытута навукі і мастацтва ў Нью-Йорку «Беларускія паэты і пісьменнікі на эміграцыі», у якой прынялі ўдзел, з аднаго боку, славутыя дзеячы беларускага адраджэння на захадзе Зора і Вітаўт Кіпелі, а з другога боку, «тутэйшыя» прадстаўнікі беларускай навукі і літаратуры. Імпрэза была арганізавана міжнародным фондам «Беларускі кнігазбор» і Саюзам беларускіх пісьменнікаў. (Рэпартаж з прэзентацыі — у наступным нумары.)

І.К.
Фота Ул. КАРМІЛКІНА.

ТБМ: рыхтуемся да з'езда

Гістарычная свядомасць — трываласць нацыі

Перад чарговым з'ездам прынята гаварыць пра набыткі, дасягненні, неразвязаныя праблемы. Аднак сёння наша агульная справа зазнала такія страты, найперш у галіне школьніцтва, што гэтая гаворка, здавалася б, у значнай ступені губляе свой сэнс, падаецца другаснай і нават дробязнай. Але, на мой погляд, не варта занадта драматызаваць сітуацыю. Усялякая справа трывалая, калі робіцца настойліва, мэтанакіравана, усвядомлена. Залішняе спадзяванне на хуткі поспех, як вядома, спараджае ілюзіі, а затым — непазбежнае расчараванне.

Падзяляючы думку, што вялікія справы робяцца маленькімі крокамі, я хацеў бы засяродзіць увагу на двух аспектах дзейнасці Таварыства беларускае мовы — тэрміналагічным і выдавецкім, якія, маючы актуальнае значэнне, усё ж болей арыентаваныя на перспектыву.

Тут мы маем пэўныя набыткі. Праца Тэрміналагічнае камісіі ТБМ, распачатая яшчэ ў 1990 годзе, сталася плённаю дзякуючы, па-першае, прыцягненню шырокага кола зацікаўленых выкладчыкаў і навукоўцаў, па-другое, арганізацыі сталых семінараў і, па-трэцяе, рэальнай магчымасці публікацыі вынікаў на грунце шчыльнага супрацоўніцтва з Выдавецкай камісіяй ТБМ. Тэрміналагічная дзейнасць абымала розныя галіны ведаў: матэма-

(Працяг на с.2.)

З нагоды

Перарэгістрацыя — толькі на падставе Закона, —

так адказаў на вуснае запытанне журналістаў «Нашага слова» 8 верасня 1995 г. намеснік міністра культуры і друку Іван Карэнда.

Ён рашуча абвергнуў тую інфармацыю, якая «праскочыла» ў газеце «Свабода» (№ 36, 8 верасня г.г.), дзе ў рэдакцыйным паведамленні аб арышце банкаўскага рахунку гэтай газеты, у прыватнасці, паведамлялася: «Наколькі нам вядома, ставіцца мэта на перыяд выбарчай кампаніі пад выглядам перарэгістрацыі газэтаў прыкрыць некалькі выданняў».

Іван Арсеньевіч сказаў, што сапраўды Міністэрствам культуры і друку праводзілася перарэгістрацыя тых выданняў, якія мелі ў сваёй назве слова «Беларусь». На гэта быў адпаведны Закон, і згодна яму падобную перарэгістрацыю прайшлі грамадскія і грамадска-палітычныя арганізацыі.

Па Закону ж аб друку і іншых СМІ, растлумачыў намеснік міністра, перарэгістрацыя перыёдыкі можа адбывацца, калі ў той ці іншай газеце або часопісе адбываюцца змены ў заснавальніцтве ці трэба выданню змяніць загаловак і г.д.

Што да перарэгістрацыі газет па палітычных прычынах, то на гэты конт ніхто Міністэрству культуры і друку ніякіх указанняў не аддаваў і наўрад ці такое парушэнне законнасці магчыма.

Вельмі хацелася б верыць нашаму паважанаму нам. міністра. Але ў часы, калі вышэйшыя ўладатрымальнікі ажыццяўляюць нічым не прыкрыты ўціск на прэсу, радыё і тэлебачанне, калі прыпыняецца выхад газет, як гэта адбылося з «Добрым вечарам», або арыштоўваюцца банкаўскія рахункі, як тое мае месца з «Свабодай», ці затрымліваецца рассылка газет падпісчыкам, як гэта нядаўна здарылася з «Нашым словам», міжволі падумаеш: а раптам?

А.М.

Дзень вайсковай славы



8 верасня беларускія нацыянал-патрыёты адзначалі вялікае свята — дату перамогі беларускім войскам на чале з Кастусём Астрожскім маскоўскага войска пад Оршай (1514 г.) З той нагоды, што менская гарадская рада забараніла гэтае святкаванне на вуліцах і плошчах горада — арганізацыйны камітэт вырашыў адзначыць свята ў памяшканні (Дом літаратара). Але, як было задумана, перш адбылося ўскладанне кветкаў да помніка Янку Купалу і Максіму Багдановічу. Згуртаваўшыся на «купалаўскім пляцы», ініцыятары, так бы мовіць, здзейснілі ўступ да святкавання. Пад бел-чырвона-белымі сцягамі спявалі беларускія песні. Міліцыя гучна абвясціла аб забароне святкавання й шэсця. Але ж пайшлі. Да Максіма Багдановіча. Ахоўнікі правапарадку ехалі ўздоўж і праз мегафон патрабавалі спыніць шэсце. Некаторыя супрацоўнікі міліцыі былі з сабакамі. Ехалі машыны са спецназам. Усё ж дайшлі й да Максіма. Дзякуй Богу, і на гэты раз не адбылося сутычкі з міліцыяй. Ніводны з бакоў не наважыўся пайсці на канфлікт. Затым — шлях у Дом літаратара.

Выступалі А.Марачкін, А.Грыцкевіч, З.Пазьняк і іншыя. А.Марачкін аб'явіў хвіліну маўчання. А.Грыцкевіч распавядаў пра бітву пад Оршай і тагачасную палітычную сітуацыю. З.Пазьняк адзначыў, што Аршанская бітва 1514 года была тыповай для беларускага войска. Лідэр БНФ вызначыў тры перавагі ваяроў К.Астрожскага: цывілізаванасць войска, вялікі ўзровень вайсковага майстэрства і адносіны між людзьмі.

Г.Смоляк выступала з дзіцячым хорам. Першую песню — «Магутны Божа...» — па традыцыі спявала стоячы зала. І.Смоляк, прамаўляючы, філасофствавала аб духоўнасці. Яе доўгі выступ атрымаўся дужа цікавы: песні, вершы, прамова. Зала падпявала ёй і хору, калі гучала:

Гэй, беларусы! Дружна ўстанем!
Наладзім з Богам свой хаўрус!
Пакуль жыве між нас яднанне —
Датуль жыве і Беларусь.

Выступалі таксама барды. Гучалі народныя мелодыі (М.Лявончык граў на цымбалах). Добра выступіў і ансамбль «Менскі гармонік».

Вядома ж, гэтае святкаванне вялікай перамогі адбылося далёка не так, як карцела арганізатарам. У лепшыя часы на пляцы «Парыжскай камуны» месца хапала ўсім.

Цяпер, праз малыя габарыты памяшкання, некаторым давялося прастаяць некалькі гадзінаў.

Генадзь КАЖАМЯКІН.
Фота Ул. КАРМІЛКІНА.

ТБМ: рыхтуемся да з'езда

Гістарычная свядомасць — трываласць нацыі

(Працяг. Пачатак на с.1.)

тыку, фізіку, біялогію, хімію. Лічу сваім абавязкам назваць імёны людзей, якія найбольш спрычыніліся да гэтае працы: Павел Міхайлаў, Вінцук Вячорка, Людміла Шлома, Тамара Сухая, Галіна Сяржаніна, Васіль Бернік, Уладзімір Самайлюковіч, Васіль Юфераў, Яраслаў Міляшкевіч, Алег Александровіч.

Зразумела, гэтая справа не магла заставацца ў рамках толькі семінараў і таму знайшла свой лагічны працяг у нацыянальных навуковых канферэнцыях, праведзеных у 1994 і 1995 гадах пад агульным назовам «Праблемы беларускай тэрміналогіі». Асноўны клопат у іх арганізацыі ўзялі на сябе Язэп Станановіч і Святлана Бельская. Значэнне праведзеных форумаў цяжка пераацаніць; гэта, без перабольшання, этапная з'ява ў развіцці нашае мовы.

Сёння мы ўжо маем «Тэрміналагічны слоўнік па вышэйшай матэматыцы», «Руска-беларускі фізічны слоўнік», «Слоўнік па заалогіі і паразіталогіі», «Слоўнік мікалагічных тэрмінаў», выпушчаныя Выдавецкай камісіяй Таварыства (найбольш актыўныя яе сябры — Мікола Гесь, Наталя Дашкевіч, Неаніла Баранава). Акрамя слоўнікаў, прапагандысцкіх брашур, кніжак па культуры мовы, гэтая камісія падрыхтавала і выдала шэраг гістарычна-асветніцкіх кніг: «Западно-руссизм» А.Цвікевіча, «Беларусь учора і сяньня» Я.Найдзюка, «Геаграфія Беларусі» А.Смоліча, «100 пытанняў і адказаў з гісторыі Беларусі». Мы лічым выданне такой літаратуры надзвычай важным, бо гістарычная свядомасць, поруч з роднаю моваю, з'яўляецца складовай часткай трываласці, імунітэту нацыі.

Беларус, адлучаны ад сваёй мовы і гісторыі, знаходзячыся ў сферы ўплыву чужых сродкаў масавай інфармацыі, успрымае і чужую культуру, і чужую самасвядомасць (хоць гэта, зразумела, эрзац-культура і эрац-свядомасць). Ён, прыкладам, перажывае за няўдачы маскоўскага «Спартака» (для яго гэта «нашы»), ён шкадуе, што Расія прадала Аляску, ён абураецца, што японцы патрабуюць вярнуць Курылы... Але ён абыякавы да праблемаў сваіх суайчыннікаў у Вільні ці на Беласточчыне. Ён ужо не здольны ўсведамляць нацыянальныя інтарэсы, бо глядзіць на свет праз чужыя акуляры.

Менавіта невысокая нацыянальная свядомасць большыні насельніцтва Беларусі — першапрычына адсутнасці станоўчых пераменаў у нашай краіне. Таму, на мой погляд, большы акцэнт у сваёй дзейнасці мы мусім зрабіць на паслядоўнай асветніцкай працы. Яна непрыкметная, вынікі яе часцей за ўсё аддаленыя, але яна абсалютна неабходная. Змены адбываюцца толькі ў тым грамадстве, якое падрыхтаванае да іх.

Зміцер САНЬКО,
намеснік старшыні
Таварыства беларускай мовы
імя Ф.Скарыны.

Збіраць сілы для абароны роднай мовы

Сёмы год дзейнічае на Беларусі Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны. За мінулыя гады прыхільнікі нацыянальнага адраджэння, якіх згуртавала Таварыства, абаранілі і прапагандавалі беларускае слова, вярталі народу ягоную родную мову.

У сучасны момант ТБМ аб'ядноўвае каля 140 гарадскіх, раённых, рэгіянальных суполак. Пры непасрэдным удзеле ТБМ падрыхтаваны Закон аб мовах, праведзена шэраг значных акцый па далучэнні да клопатаў нацыянальнага адраджэння шырокіх колаў грамадскасці (навукова-практычныя і тэматычныя канферэнцыі, «круглыя сталы», звароты да грамадзян Беларусі і інш.). Вялікі грамадскі рэзананс атрымаў «круглы стол», прысвечаны пятым угодкам прыняцця Закона аб мовах, які быў праведзены 31 студзеня г.г. у Доме літаратара. Дзякуючы актыўнай падтрымцы сродкаў масавай інфармацыі і, у першую чаргу тэлебачання і радыё, на высокім прафесійным узроўні быў падрыхтаваны цыкл тэле- і радыёперадач, што садзейнічала ўдзелу ў пасяджэнні «круглага стала» многіх тысяч грамадзян Беларусі.

Сакратарыятам ТБМ зроблены пэўныя захады па арганізацыйным умацаванні мясцовых арганізацый ТБМ.

У 1993 годзе ўтвораны Магілёўская (старшыня Рады Міхась Булавацкі) і Гарадзенская (старшыня Рады прафесар Гарадзенскага універсітэта Сцяцко Павел Уладзіміравіч) абласныя арганізацыі ТБМ. У кастрычніку мінулага года праведзена ўстаноўчая канферэнцыя Гомельскай абласной арганізацыі. Яе старшынём канферэнцыя аднагалосна абрала пісьменніка Анатоля Бароўскага. Дзякуючы намаганням шчырага прыхільніка роднай мовы прафесара Брэсцкага педінстытута Сяргея Анатольевіча Яскевіча ў гэтым годзе заснавана Брэсцкая абласная арганізацыя ТБМ. Яе старшынём быў абраны Сяргей Анатольевіч. За справаздачны перыяд створаны арганізацыі ТБМ у некаторых раёнах рэспублікі. Сярод іх Шклоўская раённая арганізацыя (28 лістапада 1994 г.), якую ўзначаліла карэспандэнт раённай газеты Вольга Паўлава.

З сакавіка 1990 г. пачала выходзіць штотыднёвая газета Таварыства беларускай мовы «Наша слова». За час свайго існавання газета, яе рэдакцыйны калектыў шмат зрабіў дзеля адраджэння беларускай мовы, аб'яднання рупліўцаў нацыянальна-культурнага адраджэння Бацькаўшчыны. За мінулыя гады сябры Таварыства прапагандавалі беларускае слова не толькі ў Беларусі, але і ў многіх краінах далёкага і блізкага замежжа. Згуртаванні прыхільнікаў беларускай мовы, актыўных змагароў за яе адраджэнне дзейнічаюць у ЗША і Англіі, Канадзе і Аўстраліі, у Польшчы, Латвіі, Летуве і Эстоніі. У Маскве, Санкт-Пецярбургу і Ашгабадзе, іншых гарадах. Змястоўную і актыўную работу сярод беларусаў Латвіі праводзіць Рыжская арганізацыя ТБМ імя Ф.Скарыны «Прамень» (старшыня Рады Алесь Карповіч). На пачатку гэтага года сябры гэтага таварыства пачалі выдаваць газету беларусаў Латвіі «Прамень» (рэд. Лявон Шакавец). Дарэчы, у дзень, калі пачне работу IV з'езд ТБМ, Рыжскай арганізацыі ТБМ споўніцца 5 гадоў. Карыстаючыся нагодай, шчыра павіншуем нашых сяброў — прыхільнікаў беларускай мовы ў Латвіі і падзякуем ім за карысную, плённую працу. Сёння нельга адназначна гаварыць аб актыўнасці мясцовых арганізацый ТБМ. Як і раней, плённа працуюць Лідская, Маладзечанская, Салігорская, Гомельская, Светлагорская, Полацкая, Круглянская, Баранавіцкая, Навагрудская, Аршанская. Трэба шчыра прызнаць, што як мясцовыя арганізацыі ТБМ, так і Сакратарыят Рэспубліканскай Рады ТБМ працуюць у вельмі складаных, цяжкіх умовах. Асабліва гэтыя ўмовы пагоршыліся пасля рэферэндуму па моўным пытанні, у выніку якога ў складанае становішча трапілі самыя шчырыя прыхільнікі ТБМ — настаўнікі. Пры той агромістай рабоце, якую вядуць мясцовыя арганізацыі ТБМ, Рэспубліканская Рада дзеля вырашэння адказнай і высакароднай задачы адраджэння роднай мовы, з боку дзяржавы няма ніякай падтрымкі. Уся работа вядзецца на грамадскіх пачатках і ўсё трымаецца на самаахвярнасці шчырых рупліўцаў роднай мовы. Між тым, Таварыства ўкраінскай мовы імя Тараса Шаўчэнкі на Украіне знаходзіцца на ўтрыманні дзяржбюджэту Украіны.

У цяжкіх і складаных умовах працуе і газета «Наша слова». Былі выпадкі, калі выпуск газеты па прычыне адсутнасці сродкаў затрымліваўся. Каб не пакрыўдзіць падпісчыкаў, прыходзілася выпускаць здвоены нумар.

Сёння хочацца падзякаваць арганізацыям, прыватным асобам, якія аказваюць матэрыяльную падтрымку ТБМ і рэдакцыі газеты «Наша слова». Нядаўна, напрыклад, жыхар Старобіна сп. Гурыновіч пералічыў 50 тыс. рублёў для газеты «Наша слова». Са сваёй сціплай пенсіі былы настаўнік з Камянца сп. Іван Жытко ўжо некалькі разоў прысылаў грошы для ТБМ.

Мы вельмі ўдзячны Гомельскаму дырэктару МВПА імя Я.Коласа В.І.Германаву, які прыняў па нашай просьбе нялёгкае для яго рашэнне аб змяшчэнні аплаты за выданне брашуры са Статутам ТБМ у суме 2 млн. 360 тыс. рублёў. Шчыра дзякуем акцыянернаму таварыству «Спортплюс», ад якога мы атрымалі спонсарскую дапамогу ў суме 615 тыс. рублёў (дырэктар Піскун Андрэй Уладзіміравіч, камерцыйны дырэктар Занкевіч Сяргей Міхайлавіч). Пры абмеркаванні на Сакратарыяце ТБМ 23 траўня г.г. пытання «Аб дзейнасці арганізацый ТБМ у сувязі з вынікамі рэспубліканскага рэферэндуму па моўным пытанні», было падкрэслена, што вынікі рэферэндуму стварылі сітуацыю, якая вымагае ад усіх нас пошукаў новых форм і метадаў работы, аб'яднання дзеля абароны мовы ўсіх прагрэсіўных сіл. «Ні ў якім разе, — падкрэсліў старшыня ТБМ Ніл Гілевіч, — нельга дапусціць, каб новыя ўмовы паўплывалі на змяншэнне актыўнасці рупліўцаў за родную мову, а, наадварот, трэба паклапаціцца, каб умацаваць першасныя суполкі, ажывіць іх дзейнасць. Каб наша родная мова запанавала ў Беларусі паўсюдна і назаўсёды». Гэтыя ўзнёслыя словы, якія сказаў напрыканцы свайго даклада на III з'ездзе старшыня ТБМ Ніл Гілевіч, сёння, у пасляферэндны перыяд гучаць як заклік да ўсіх патрыётаў Бацькаўшчыны да актыўнай паўсядзённай барацьбы за выратаванне роднай мовы. Няхай гэтаму дапамогуць набытыя за мінулыя гады вопыт, матэрыяльныя і інтэлектуальныя здабыткі.

Трэба збіраць сілы для актыўнай абароны роднай мовы.

В.ВІЛЬТОЎСКІ,
сакратар ТБМ імя Ф.Скарыны.

На пачатку верасня ў маёй кватэры зазваніў тэлефон.

— Едзеш на бардаўскі фэст пад Оршу? — пачуў я голас знаёмага — Кажуць, там усе «ультра» збіраюцца!

Ведаючы, што гэткім абазначэннем ён карыстаецца ў дачыненні да людзей свядомых сваёй беларускасці, я не здзівіўся пытанню. Прымеркаванае да гадавіны перамогі ў бітве пад Оршай свята бардаўскай песні на Крапівенскім полі за час свайго існавання і сапраўды сфармавала кола ўласных удзельнікаў — людзей, не абыякавых да лёсу краю — і выканаўцаў, і слухачоў, — якія збіраліся на яго з розных канцоў Беларусі.

— Еду, — адказаў я.

«Аршанскай бітвы» не было

Восьмага верасня вакол Оршы ішлі дажджы. Шафёр аўтобуса, што вёз нас з вакзала да вёскі Гацькаўшчына, недалёка ад якой адбываецца фэст, высадзіў усіх на шашы, патлумачыўшы, што далей ехаць не зможа. Апошні кіламетр давялося ісці пешшу. Тады і адбылося першае маё знаёмства з удзельнікамі свята песні.

Наперадзе мясіла нагамі мокрую гліну дзіўнаватая пара — высокая доўгавалосая дзяўчына, якая ішла, абдымаючы за талію невысокага хлопца з выгаленымі скронямі, — абое ў чорным джынсе і высокіх АМОНаўскіх бацінках... Дзяўчына паслізнулася і ледзьве не ўпала, згадаўшы пры тым на мове міжнацыянальных зносін нечыю маці.

— Я ...ею, — піскляваватым голасам адказаў яе спадарожнік, і стала зразумела, што мяне ўвяла ў зман іхняя аднолькавая вопратка і неардынарнасць фрызур.

Наперадзе адкрылася Крапівенскае поле. Я здзіўлена спыніўся: месца сабе на ім знайшлі дзесяткі хлопцаў і дзяўчат, якім чорныя курткі, вузкія джынсы, армейскага ўзору бацінкі, чорныя майкі з выявамі чарапоў, мерцвякоў, розных пачвар ды іншая атрыбутыка аматараў «цяжкага металу» надавала блізнячае падабенства. У парушэнне традыцый фестывалю, над полем гучала мова не пераможцаў, а пераможаных ці, дакладней, сучасны казарменны яе варыянт. Колькасна меншыя ўдзельнікі папярэдніх фэстаў са здзіўленнем глядзелі на новых яго гасцей. Здзіўленасць другога боку прысутнасцю «ультра» была не меншай.

«Нетыповыя французы», — сказаў герой фільма Эктара Бабенкі, гледзячы на парыжан, якія пару дзён таму пераехалі на сваю новую радзіму з Блізкага Усходу. На пытанне, хто і адкуль гэтыя не зусім тыповыя беларусы, я пачуў адказ аднаго з арганізатараў фэсту: гэта — запрошаныя да ўдзелу ў свяце рок-музыканты, разам з якімі прыехалі іхнія фэны.

З-за дажджу апаратура рокераў не працавала, таму першы вечар фэсту быў аддадзены выканаўцам, якія абыходзіліся без электронікі, — бардам. Як аказалася, змены адбыліся і тут. Невядома, ці існавала ў прыродзе праграма фестывалю, спіс запрошаных выканаўцаў ці хаця б нейкі іх адбор. Бо кожны, хто жадаў паспяваць, проста паведамляў пра гэта вядучаму фестывалю Юрыю Копціку і той без затрымкі абвяшчаў новага выканаўцу. Дзякуючы гэтаму прысутныя пазнаёміліся з мноствам спевакоў, імёны якіх, тэксты песень ды іх мелодыі наўрад ці захацеў запомніць нехта з прысутных. Да таго ж нешматлікія беларускія выканаўцы спявалі пераважна пра гаротную беларускую зямельку, пра гаротны беларускі народ, пра гаротную яго мову, ствараючы ўражанне, што сабраліся тут не свабодныя людзі — нашчадкі пераможцаў у бітве пад Оршай, а паняволеныя мазахісты. Скарыстаўшы свабодны доступ да мікрафона, свята разнастаіў выканаўца распаўсюджанага ў расійскім фальклоры стылю зладзейскай песні, праспяваўшы расійскі раманс пра маладога вязня, якога па снезе Калымы вядзе на расстрэл родны брат, адбіўшы перад тым у небаракі каханую.

— Ну что, понравілось? Я вам ешчё блатнее могу спеть — так, что вы все кіпятком пісать будете! Хотіте — похлопайте! — прапанаваў ён, няцвёрда вымаўляючы словы.

«Ультра», якія пра Калыму і без таго добра ведалі з расказаў старэйшага пакалення і ў дадатак не захапляліся расійскімі рамансамі, прапановы не прынялі. Змаўчалі і рокеры — аматары іншых тэм і рытмаў. Становішча паспрабавала палепшыць нейкая дзяўчына, праспяваўшы чарговую расійскую песню, але пазбаўленую блатной рамантыкі. Слухачы па-ранейшаму маўчалі — адны, успамінаючы папярэднія фэсты, чакалі беларускіх песень, другія, не дачакаўшыся рока, паціху разыходзіліся па намётах, адкуль гучалі родная ім музыка, мова нашых усходніх суседзяў ды бульканне.

У свой першы вечар фестываль нагадваў пацыента аддзялення рэанімацыі — ён паміраў і не мог памерці. Не мог ён і жыць — пераважная большасць спевакоў яўна не мела ніякага ўяўлення ані пра беларускую, ані пра бардаўскую песню наогул. Знудзіўшыся, апошнія слухачы разыходзіліся спаць.

Наступным ранкам мяне абудзіў гук басовага бубна. Дождж скончыўся, і доўгавалосыя хлопцы наладжвалі на сцэне апаратуру ды інструменты. Падрыхтоўка цягнулася каля шасці гадзін, калі раптам галас сціх. У нечаканай цішыні некалькі хлопцаў узышлі на пагорак і над полем узняўся вялікі драўляны крыж з Пагоняй і словамі памяці пераможцам у бітве 1514 года. «Ойча наш, які ёсць у небе...» — паўтаралі ўслед за ксяндзом, які асвячаў крыж, словы малітвы ўсе сабраныя.

Абрад скончыўся, і над полем зноў запанаваў настрой тусоўкі. Не прайшло і гадзіны, як пачаўся канцэрт другога дня. Але характар гукаў, што ляцелі са сцэны, змяніўся мала: стыль выканання музыкаў больш нагадваў працэс наладкі апаратуры. Адпаведнымі былі і тэксты песень — на англійскай мове з рэчыцкім акцэнтам новае пакаленне беларусаў спявала аб параноі, эўтаназіі, нябожчыках ды іншых цікавых яму рэчах. Адзін гурт змяняў другі, але ні стыль музыкі, ні змест песень не змяніўся. На пляцоўцы перад сцэнай падскоквалі некалькі аматараў металу. Неаматары трымаліся далей, не жадаючы набыць галаўны боль — слабасць ігры кампенсавалася гучнасцю. Апошняй на сцэну выйшла чарговая металёвая каманда з чарговай тыпова беларускай назвай «Годс таўэр», якая, у адрозненне ад сваіх папярэднікаў, паказала, што ўмее не толькі трымаць гітары, але і граць на іх. Слухачам паведамілі: музыкі так любяць родную старонку, што нават выконваюць адну песню па-беларуску і не абы-як, а мовай дзевятага стагоддзя, не патлумачыўшы, праўда, што гэта за мова і хто аўтар вершаў. Але сёння, прагучала далей, гэтая выдатная песня выконвацца не будзе. Спевы і надалей гучалі на роднай мове англамоўных беларусаў.

З цяжкасцю адшукаўшы вядучага фэсту Юрыя Копціка, які з сваімі даўгімі валасамі, чорнай курткай і ланцугом на руцэ лёгка губляўся ў натоўпе металістаў, я спытаў, як трапілі сюды людзі, мякка кажучы, выпадковыя.

— Мы запрасілі гомельскі гурт «Годс таўэр», але разам з ім прыехалі яшчэ чатыры каманды. Няёмка было ім адмаўляць...

Трохі паспрачаўшыся, беларускія ці не гучалі сёння песні, мы разышліся. Рок-канцэрт скончыў-

(Працяг на с.7.)

Падрабязнасці

У абарону вольнага слова

Як паведамлялася ўжо, у пісьменніцкім Доме творчасці «Ісламч» адбыўся Другі Міжнародны кангрэс у абарону дэмакратыі і культуры. Яго арганізаваў Беларускі пэн-цэнтр пры падтрымцы Беларускага фонду Сораса. 100 чалавек — пісьменнікі і журналісты, правазнаўцы і гісторыкі, палітолагі і палітыкі, навукоўцы разнастайных гуманітарных накірункаў — прадстаўлялі 15 краін свету. Яны разважалі на даволі балючую тэму — «Незалежная прэса: свабода і адказнасць».

1. Філасофія Васіля Быкава

Выступленне прэзідэнта пэн-цэнтра народнага пісьменніка Беларусі і слыннага публіцыста Васіля Быкава ў першы дзень працы кангрэса паклала філасофскі пачатак размове на кангрэсе менавіта пра тыя разбуральныя працэсы, якія зведвае наша культура ў постсавецкім, посттаталітарным грамадстве. Свабода мастака, аўтара выказвацца і дыктатарскія рэжымы — рэчы не проста не сумяшчальныя, што ў XX стагоддзі ўжо засведчылі фашызм ды бальшавізм. Васіль Быкаў заўважае: «Тое, што заснавана на няволі і прымусе, не мае патрэбы ў прыгажосці і праўдзе». Гэта, так бы мовіць, культурныя імператывы. Іх, як зазначыў народны пісьменнік, не абвергнеш, бо для дыктатарскіх рэжымаў культура — сірата, таталітарызму яна наогул не патрэбная.

І сучасная культура пераўтвараецца ў абсурд.

Галоўным сродкам мастацкай выяўнасці амаль усіх відаў мастацтваў робіцца эпатаж, шокінг, імкненне ўразіць, задурманіць, эстэтыка музычнага выяўлення даўно ўвасобілася ў колькасці дэцыбелаў; традыцыйна непрымальны ў хрысціянскай культуры адкрыты, дзікі секс набывае галоўны змест усіх візуальных сродкаў мастацтва і паспяхова ўкараняецца ў літаратуры. Вызначальная ў культуры катэгорыя якасці спрэс падмяняецца супрацьлеглай катэгорыяй колькасці, што, бы ў фінансавай сферы, робіцца вызначальнай поспеху. Стандарты камерцыйна-гандлёвай маскультуры амаль цалкам захапілі музыку, кіно, выяўленчае мастацтва, паспяхова апаноўваюць тэатр і літаратуру. Прыгажосць з вышэйшага, сакральнага боства, якім было ў чалавечай цывілізацыі, ператвараецца ў папулярны шырспажыў, крыніцу мільённых прыбыткаў для спрытнюг і нахабнікаў ад мастацтваў, чаму не ў малой ступені садзейнічаюць пэўныя палітычныя сілы, зразумела, ва ўласных, асабліва палітычных мэтах, лічыць народны пісьменнік.

Што ж такое сённяшняя масавая культура?

Васіль Быкаў сцвярджае: «Маскультура — не культура наогул, якой часам здаецца, а яе антыпод, немінучы яе магільшчык».

Аналізуючы далей небяспечнасць для грамадства маскультуры, народны пісьменнік робіць выснову, «што прадукты яе распаду дзейнічаюць не толькі на амбіцыі дыктатараў, сілкуюць іх дыктатарскія эмоцыі, але і атручваюць свядомасць масавага грамадства», актыўна пранікаючы ў падсвядомасць, на генетычным узроўні развіваюць далёка не лепшыя інстынкты, закладзеныя ў чалавека дзікай прыродай. Нескароная ўлада нізкіх інстынктаў з маскультуры так ці інакш пранікае ў эканоміку, палітыку, цалкам абслугоўвае крыміналітэт, у горшы бок мяняе гістарычна сфармаваны менталітэт этнасаў».

Ну, а што ж мы, творцы? Дзе нашая пазіцыя? На вялікі жаль, немалая частка творчай інтэлігенцыі даўно пайшла на канфармізм, згодніцтва з дыктатарскімі рэжымамі, капітулявала перад разбуральнай сілай антыкультуры, якая на руку ўладатрымальнікам. Пазіцыя мастака «над схваткай», яго духоўная калабарацыя з дыктатарамі, чыя ідэалогія — працяг колішняй імперскай палітыкі з парушэннем правоў Чалавека, асуджае творцу на духоўную паразу, а культуру — на выраджэнне. Так лічыць Васіль Быкаў. І гэтаму пярэчыць вельмі цяжка — трэба толькі зірнуць на кніжныя латкі ды паліцы, раскрыць многія часопісы ды штотыднёвікі, пасядзець вечар-іншы перад тэлевізарам. Яскравы прыклад гэткага канфармізму — фільм Юрыя Азаронка «Нянавісць. Дзеці хлусні...»

І падобны наплыў антыкультуры спыніць не проста — яна мае вялікія грошы, якімі яе забяспечвае ідэалагічная надбудова маючых уладу дыктатарскіх рэжымаў, што па назіранню Васіля Быкава «паспяхова мімікруюць пад дэмакратыю». «Яны штурхаюць культуру на ўзровень служкі за ўсё і з яе дапамогай канчаткова нішчаць і без таго ніцыя парасткі дэмакратыі. У масавай свядомасці між тым ідзе актыўны працэс дыскрэдытацыі ідэяў дэмакратыі наогул. Уласная дэмакратыя для беларусаў паранейшаму вельмі праблемная нават у аддаленай будучыні».

Якое ж выйсце бачыць прэзідэнт Беларускага пэн-цэнтра з дадзенай сітуацыі? Якую бачыць магчымасць, каб папярэдзіць агонію культуры?

Гэта перш-наперш — адраджэнне нацыянальнай культуры на еўрапейскіх гуманістычных традыцыях, «якія доўга падаўляліся ў нас». Менавіта гэтыя традыцыі, сцвярджае народны пісьменнік, яшчэ паслужаць і нацыі, і чалавецтву, бо культура бязмежная ў прасторы і, «будучы нацыянальнай па паходжанню, належыць усяму чалавецтву». Бо культура — прадукт чалавечай цывілізацыі, існасць яе нязменных каштоўнасцяў.

Але, заўважае Васіль Быкаў, тут ёсць складанасць: адраджэнню сапраўды нацыянальнай і сапраўды гуманістычнай культуры патрэбныя адпаведныя ўмовы — «дабратворная атмасфера, адкрытае свету, зусім дэмакратычнае грамадства, да якога мы імкнёмся. А без дэмакратыі, якой бы праблематычнай яна ні была, няма будучыні, як няма і самой культуры».

2. Што да Закона аб друку...

Гэты раздзел справаздачы пачну з вельмі цікавага, на маю думку, дакумента, які за подпісам намесніка старшыні Камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па пытаннях галоснасці, сродкаў масавай інфармацыі і правоў чалавека Анатоля Вярцінскага прыйшоў 29 жніўня 1995 года на імя прэзідэнта Беларускага пэн-цэнтра Васіля Быкава. Як раз напярэдадні пачатку працы кангрэса:

«Шаноўны спадар прэзідэнт!

Хацеў бы давесці да Вашага ведама, а праз Вас і да ведама ўдзельнікаў Другога Міжнароднага кангрэса пэн-цэнтра ў абарону дэмакратыі і культуры наступную даведку.

Як Вы памятаеце, на Першым Міжнародным кангрэсе пэн-цэнтра разглядалася і пытанне аб праекце Закона «Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі». Была прынята Дэкларацыя кангрэса «Аб абароне свабоды слова і забеспячэнні права на інфармацыю ў Беларусі», дзе змяшчаліся і крытычныя заўвагі ў адрас законапраекта, а таксама былі потым сфармуляваны, у парадку заканадаўчай ініцыятывы пэн-цэнтра, адпаведныя заўвагі і дапаўненні для разгляду іх у працэсе падрыхтоўкі і прыняцця закона. Заканадаўчая ініцыятыва пэн-цэнтра была падтрымана Міжнародным кангрэсам і даведзена да ведама членаў дэпутацкай Камісіі па пытаннях галоснасці, сродкаў масавай інфармацыі і правоў чалавека. Большасць прапаноў была ўхвалена.

На жаль, не ўсе яны былі падтрыманы большасцю Вярхоўнага Савета падчас прыняцця Закона ў другім чытанні (канчаткова ён быў прыняты 13 студзеня г.г.). Але ў той жа час некаторыя палажэнні і нормы Закона ўдалося ўдасканаліць у адпаведнасці з прапановамі пэн-цэнтра, а таксама з рэкамендацыямі, якія былі выпрацаваны на Міжнароднай канферэнцыі на тэму «Закон аб друку і працэс дэмакратызацыі», праведзенай у маі 94-га года Мас-Медыа Цэнтрам у Мінску — праект фонду Сораса — Беларусь. Так, напрыклад, з артыкула 4 Закона («Недапушчальнасць цэнзуры масавай інфармацыі») было знята патрабаванне папярэдне ўзгадняць паведамленні і матэрыялы з некаторымі катэгорыямі асоб; затое вызначэнне паняцця «цэнзура масавай інфармацыі» было дапоўнена ў канчатковым варыянце словамі: «...а таксама патрабаванне зняць з друку (эфіру) той ці іншы матэрыял або паведамленне». Узмоцнена пазіцыя суб'ектаў СМІ ў плане права на атрыманне інфармацыі, «права ведаць» у артыкулах 32 («Права на атрыманне інфармацыі») і 33 («Выпадкі адмовы або адтэрміноўкі ў прадстаўленні інфармацыі»). Уведзены новы, у параўнанні з першымі варыянтамі законапраекта, артыкул 41 «Гарантыі сацыяльнай абароны журналіста». Што датычыць артыкула 45 («Адказнасць за злоўжыванне свабодай масавай інфармацыі»), дзе дапускалася занадта вольнае, двухсэнсоўнае вытлумачэнне так званага «злоўжывання правамі журналіста» («...распаўсюджванне чутак пад выглядам дакладных паведамленняў», «...збор інфармацыі ў карысць пастаронняй асобы...» і г.д.), то гэты артыкул выключаны з закона цалкам. Гэтак жа, як зняты і артыкул «Кампенсацыя маральнай шкоды», які заахвочваў, па сутнасці, чыноўнікаў прыцягваць да судовай адказнасці рэдакцыі або асобных журналістаў за нібыта нанесеную абразу іх «гонару і годнасці».

Нельга не прызнаць у той жа час, што на тэксце Закона, на некаторых яго артыкулах і палажэннях адбіліся, не маглі не адбіцца, асаблівасці той грамадска-палітычнай і ідэалагічнай абстаноўкі ў рэспубліцы, для характарыстыкі якой ключавымі паняццямі могуць быць словы «пераход» і «няпэўнасць».

У многіх узнікла пытанне: дык за што змагаліся? Закон, пра які казаў Анатоль Вярцінскі, мала таго, што недасканалы, але і гэткі не працуе. Паміж тым як «Хартыя вольнасцяў» для СМІ і найперш для прэсы, якая замацоўвалася ў прысавецкі час Законам аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі ў СССР і якая праіснавала каля дзевяці гадоў на Беларусі, нягледзячы на пэўныя недахопы, была даволі сур'ёзнай перашкодай на шляху многіх антыдэмакратычных праяў.

Зразумела, незалежнай дзяржаве быў патрэбны свой Закон, які тычыўся б правоў і абавязкаў прэсы, журналістаў, заснавальнікаў ды выдаўцоў. Рэакцыя ў парламенце вельмі добра ведала: гэты Закон можа стаць лёсавызначальным для развіцця дэмакратыі ў краіне. Некалькі гадоў адпаведная Камісія ВС распрацоўвала дакумент, потым яшчэ цэлы год прымала яго.

Знарок — без шырокага належнага абмеркавання грамадзянамі ды без уліку меркаванняў журналісцкіх калектываў.

А тым часам «учарашнія» звярэлі. Яны проста зацягалі па судах журналістаў і пісьменнікаў-публіцыстаў, якія выступалі супраць адэптаў таталітарнай сістэмы. У 1994 годзе такіх спраў налічвалася 130, з якіх толькі 20 выйгралі журналісты. З рэдакцый і аўтараў спаганяліся велізарныя штрафы на карысць тых жа дзяржаўных чыноўнікаў кшталту спадара Данілава, чыю «годнасць і гонар» закранула прэса. Журналісты чакалі справядлівага Закона.

Але што атрымалі? Мяркуйце самі.

Па-першае, Закон не абараняе прэсу і аўтара. Гэты дакумент не ўводзіць тэрмін ісковай даўнасці прэтэнзій да журналіста, хаця па Закону аўтар павінен захоўваць у сваім архіве матэрыялы, на падставе якіх рыхтавалася публікацыя (копіі дакументаў, пісьмовыя сведчанні апытаных грамадзян, дыктафонныя плёнкі і г.д.), роўна год. Закон не звяртае ўвагу судовых органаў на тое, што вінаватасць журналіста або рэдакцыі павінна быць належным чынам даказана і ў крымінальных, і ў судовых справах, што ўсялякі сумнеў павінен тлумачыцца на карысць аўтара і рэдакцыі, якія валодаюць у такіх выпадках прэзумпцыяй невінаватасці. Журналісты ў сваёй пераважнай большасці лічаць: Закон павінен быў увесці таксама пэўныя абмежаванні для пэўнай катэгорыі асобаў зводзіць свае рахункі з друкаванымі органамі праз суд, як гэта, між іншым, прынята ў цывілізаваных краінах. Там чыноўнікі дзяржаўнага рангу на ўсіх паверхах улады не маюць права менавіта праз суд прад'явіць прэтэнзіі да журналістаў і рэдакцый ды настойваць на іх матэрыяльнай адказнасці за маральны ўрон пацярпелых ад той ці іншай публікацыі. Ім згодна цывілізаваных нормаў права для выказвання свайго пункту гледжання прадастаўляецца месца на старонках друкаваных органаў-«крыўдзіцеляў».

У Законе не вызначана і мяжа матэрыяльнай адказнасці аўтараў і рэдакцый за нанесены ўрон пацярпелым па выніках судовых спраў: дзяры, начальнік, колькі ўздумаецца!

У Законе не знайшло месца і тое, што як аўтары, так і органы друку не павінны пераследавацца з прычыны іхніх палітычных перакананняў, веравызнання, прыналежнасці да той ці іншай нацыянальнасці. А такі запіс на сённяшні час быў бы надзвычай патрэбны, калі панславісцкая шавіністычная раць распачала сапраўдную вайну супраць дэмакратычнай журналістыкі толькі за тое, што мае смеласць выказаць свае погляды на грамадскае жыццё, беларускасць, на ход эканамічнага развіцця, на палітычныя і міжнацыянальныя дачыненні ў краіне. З Закона быў выкінуты той раздзел, які абяцаў заахвочваць развіццё менавіта нацыянальнай, беларускамоўнай журналістыкі.

(Працяг будзе.)

Алесь МІКАЛАЙЧАНКА,
сябра аргкамітэта Беларускай асацыяцыі журналістаў,
спецыяльны карэспандэнт «Нашага слова».

Уздоўж Пцічы

Працягваецца экскурсійны сезон у клубе аматараў беларускай гісторыі і культуры пры «беларускай хатцы» ў Менску. 20 жніўня адбылася вандроўка па старых сядзібах менскіх ваколіц. Тэматыку падарожжа ў значнай ступені падказала нядаўняя выстава ў Мастацкім музеі твораў С.Жукоўскага, які на сваіх карцінах адлюстраваў дух старых шляхецкіх сядзіб Беларусі. Цікавую экскурсію па выставе правяла даўні сябра клуба, мастацтвазнаўца Ларыса Фінкельштэйн. А багаты матэрыял, што з'явіўся апошнім часам пра Ельскіх і комплекс «Дудуткі», вызначыў накірунак вандроўкі — уздоўж Пцічы.

Няшмат захавалася маёнткаў ці нават іх рэштак. Але нават па тым, што засталося, можна ўявіць, якую прыгажосць мелі сядзібы, бо ствараліся яны ў маляўнічых мясцінах па берагах рэк, з цудоўнымі краявідамі, на натуральных ці штучных пагорках і тэрасах.

Лепей за іншыя выглядае сёння Лошыца, дзе вядуцца рэстаўрацыйныя работы. У мінулым стагоддзі ў Лошыцы збіралася дэмакратычная інтэлігенцыя Менска, частым госцем тут быў В.Дунін-Марцінкевіч. Як Лошыца, так і недалёкія Каралішчавічы належалі тады Прушынскім. У Каралішчавічах пісала сваю кнігу «Літоўская гаспадыня» вядомая жанчына XIX ст. Ганна Цюндзявіцкая. У гэтай вёсцы мы наведалі магілу вядомага паэта-«узвышэнца» Язэпа Пушчы. Своеасаблівая сядзіба — дом творчасці пісьменнікаў імя Я.Коласа — да 1986 года месцілася ў Каралішчаўскім лесе. Стары будынак з мемарыяльнай плітой Я.Коласу цяпер стаў часткай Дома адпачынку «На ростанях». Усіх уразіў прыгожы сядзібны дом Вільгельма Ельскага, абкружаны экзотамі, у Ігнацічах. Тут гаспадар меў вялікія гадавальнікі і аранжарэі, дзе вялася селекцыйная работа. Праз колішнія шляхецкія засценкі (Самуэлева, Шабуні, Ніціеўскія) шлях пралягаў у Дудзічы. У спякоту прыемна было наталіць смагу з дудзіцкай крыніцы. Па рэштках шлюзавай сістэмы (якая не мела аналагаў на Беларусі) на Пцічы мы адправіліся ў музей рамёстваў «Дудуткі» фірмы «Паліфакт». Аканом сядзібы В.Я.Сарока з задавальненнем прыняў менскіх гасцей і правёў па ўсіх залах музейна-вытворчага комплексу. Суседняя з Дудзічамі Замосце належала краязнаўцу Аляксандру Ельскаму. На жаль, пра сядзібу нагадваюць толькі старыя ліставыя прысады. Рэштка колішняга «Герадотава мора» лічыцца Сяргееўскае возера. Міма яго мы кіраваліся ў Таўкачэвічы — былы маёнтак Грабоўскіх, суседзяў Ельскіх. Тут захаваліся сажалкі, парк і свіран.

У падарожжы былі сустрэчы з цікавымі людзьмі. У вёсцы Пціч жыве 86-гадовы Аляксандр Іванавіч Кучынскі, былы настаўнік беларускай мовы, чалавек складанага лёсу, які знаёмы з У.Дудзіцкім, С.П.Шушкевічам і іншымі беларускімі пісьменнікамі. С.П.Шушкевіч прысвяціў яму верш, які мы змаглі прачытаць у гаспадара. Захоўвае ён і старыя фотаздымкі сваіх сяброў. А ў Шацку, дзе завяршылася падарожжа, мы сустрэліся з механізатарам Міхасём Міхайлавічам Тарасевічам. На месцах расстрэлаў фашыстамі габрэяў і настаўнікаў мястэчка Шацк ён паставіў створаныя ім самім і асвянцоныя праваслаўнымі святарамі помнікі бязвінным ахвярам вайны.

Экскурсія паказала багацце гісторыі і цікавасць, якую маюць многія амаль невядомыя сёння мясціны ваколіц беларускай сталіцы, а таксама іх жыхары.

Ігар ГАТАЛЬСКІ.

Згадкі

Згадкі

Размова сястрыц

Да 100-годдзя Ванды ЛЯВІЦКАЙ

Сястрыца, сястрычка... Гэтак проста і шчыра, неяк па-свойску называлі колісь адна адну ў сваёй далёкай маладосці Зоська Верас, тады Людвіка Сівіцкая, і дачка пісьменніка Ядвігіна Ш. Ванда Лявіцкая — ім лёсіла не адзін год разам жыць, працаваць. Гэта было ў чатырнаццатых-семнаццатых гадах нашага стагоддзя. Затым даўнія сяброўкі не з свае волі згубілі адна адну. І надоўга. Кожная з іх пражыла нялёгкае, а нават і драматычнае жыццё. Але напачатку шасцідзесятых гадоў яны знайшліся. Радасць іхняя была неймаверная. Зоська Верас з гэтай нагоды пісала:«Вільня. 15.VIII.64

Дарагая мая, мілая Вандачка!

Цэлы тыдзень, як атрымала Твой ліст, хаджу, як адуранёшая ад радасці, а нават шчасьця. Ці я спадзявалася, што яшчэ ў жыцці буду мець з кім падзяліцца і думкамі, і радасцю, і горам?.. Я паміма што жыву з дзяцьмі, вельмі адзінокая. Маладое пакаленне жыве сваім цяперашнім днём, а мы, старыя — нам можа даражэйшае тое, што было..., а і цяперашняе, асабліва тое, што баліць, не заўсёды выскажаш».

Так, кожная з колішніх прыяцелак, колішніх сябровак пражыла па-свойму нялёгкае жыццё. Аднак Зоська Верас мела адну адзіную перавагу перад сваёй прыяцелькай: яна была бліжэй да Беларусі, цікавілася, сачыла, што рабілася ў горадзе яе юнацтва — у Менску, якому было наканавана з рупнасці яе і яе аднадумцаў стаць сталіцай. Да яе часта завітвалі госці. Дый і ў самой Вільні цеплілася хоць якое беларускае жыццё. Ванда ж была цалкам адлучаная ад Беларусі. Яна страціла з Бацькаўшчынай усялякую повязь. І вось Зоська Верас, акрыленая, што знайшлася яе даўняя сяброўка, пачала катурхаць яе да ўспамінаў. І пачалі яны абедзве згадваць, як яны колісь працавалі на адраджэнне Беларусі. Пра гэта пераважна змест іхняга, адноўленага ў 1964 годзе ліставання.

Ванда Лявіцкая нарадзілася ў 1895 годзе. Сёлета ў верасні ёй сто гадоў. Сотыя ж угодкі Зоські Верас — Людвікі Сівіцкай — мы адзначалі ў 1992 годзе. То слухайма, як яны жылі, што турбавала іх, непакоіла.

Ванда Лявіцкая
2.01.1965 г.
татарка Стаўропальскага краю

Дарагая Людачка!

Памажы мне ўспомніць адну штуку: ці была ў 1915 ці 16-м годзе выдана маленькая кніжачка Б.Тарашкевіча «Граматыка беларускай мовы»? Мне помніцца, што яна была ў жоўтым пераплёце, (як агортачная папера) і была ў прадажы ў «Бел. кнігарні». Мне пішуць, што гэта магло быць у 1918 г., а ў 18-м годзе ў нас ужо кнігарні не было — а была рэдакцыя на той жа Захараўскай вул., толькі не 24, а № 28 ці 30 — такая «галубятня» з бальконам, а я ўжо працавала ў школе, жыла на Старажоўскай № 1. Няўжо гэта мой «старческий бред»? Мне здаецца, я і цяпер бачу гэтую кніжачку — жоўценькую са светла-шэрай спінкай. Выд. Вільні. Ну, памагай, калі можаш! Можа ў каго яна захавалася?

Мяне просяць напісаць успаміны аб такіх дзеячах бел.руху, якіх я ведала. На тое, што я напішу, мала надзеі — здароўе часам добра, а другі дзень — ня хочацца жыць на свеце. А тут яшчэ, як бачыш, «zakrecenie mozgow» — путаю ўсё. — І людзей і падзеі — ды яшчэ шмат каго бачыла, а працаваць разам прыходзілася мала. Выбачай за шпаргалку — нашы спяць і не магу найсці паперы. Цалую, абнімаю.

В.Л.
Зоська Верас
Вільня. 16.III.65 г.

Даражэнькая мая Вандзя!

Увесь час ня сходзіш з маёй памяці, а што не адразу напісала, то таму, што чакала адказу ад Веры Андрэеўны Тарашкевіч. Якраз сягоння атрымала ад Яе ліст. Яна сама граматыкі не мае, бо ў яе ўсё згарэла, але шукае ў людзей, і мне прыслала адрас таго чалавека (ён быццам мяне ведае, але я яго не), каторы можа граматыку дастаць — 1-ае выданне. Але і яны кажуць, што першае выданне выйшла ў 1918 годзе...

Сягоння я дастала ліст ад Алесі... Алеся піша, што ты прасіла напісаць усё аб М.Багдановічу. На жаль, яе яшчэ тады не было ў Менску, як Багдановіч прыехаў і выехаў. Якраз у мяне гэтых некалькі месяцаў жывуць у памяці. Максімаў бацька, працаваўшы ў Менску, дзе ў 1891 годзе радзіўся Максім. Пасля Багдановічы выехалі ў Ноўгарад, а далей у Яраслаўль, дзе бацька працаваў як вучыцель гімназіі. У Яраслаўлі Максім скончыў гімназію і паступіў у юрыдычны ліцэй. У 1911 годзе прыязджаў у Вільню, каб пазнаёміцца з Бацькаўшчынай. А ў 1916 годзе, магчыма, адчуваючы, што нядоўга ўжо яму астаецца жыць, прыехаў у Менск, каб, як казаў, пабыць між сваімі і дыхнуць паветрам Бацькаўшчыны. Жыў увесь час у Бядулі на Мала-Георгіеўскай вуліцы, але і сьнедаў і абедаў у беларускай сталоўцы — «Хатцы» на Захараўскай. Тады сталоўкай загадвала мая мама і мы там жылі, помніцца ў апошнім тым даўгім пакоі. Максім Б. працаваў у магістраце, а я праз некалькі месяцаў працавала ў Земскім Саюзе, так што мы з Максімам кожны дзень разам снедалі і разам ішлі на работу — было па дарозе, а ўвечары пасля гарбаты ён доўга сядзеў у фатэлі ў тым пакойчыку, дзе балькон. Сядзеў без лямпы, пацёмку адпачываў-думаў. Мы не раз пыталіся: можа даць святло, але ён адмаўляўся: не, не нічога не трэба, мне так добра, спакойна!.. Вельмі не дбаў аб сабе, нават аб лякарствах не помніў. Мама мая ўзяла да сябе яго лякарствы і тры разы на дзень сама яму давала... Пад вясну 1917 года чуўся ўсё горш і горш. Тады здабылі грошы — як — не помню, гэтым займаўся Смоліч — і ўгаварылі яго ехаць лячыцца. Мы хацелі ўсе яго праводзіць, але ён не хацеў, пажагнаўся з усімі ў сталоўцы: праводзіў адзін Смоліч. Апошні час яму цяжка было гаварыць, а я, як помніш, дрэнна чула. І вось ён, жагнаючыся, сказаў маёй маме: «Мне трудна гаварыць, а п.Людвіка дрэнна чуе, хацеў бы сказаць шмат-шмат мілых слоў, як заеду — напішу». Не напісаў, не хапіла сілы...

Вандзя, я помню, што ты перапісвалася з Максімам яшчэ перад яго прыездам? Ці ў цябе нічога не захавалася? Я маю толькі маленькую карталюшку з гульні «ў пошту» і гэта ўсё. Гэтак выйшла, што ўвесь ліст праб М.Багдановічу.

Цалую моцна. Твая Люда.
Ванда Лявіцкая 26.III.1965

Людачка, родненькая!

Даруй за маўчанку. Перахварэла, страціла сілу, а яе і так мала было. Нават пісаць ня хочацца. Ведаеш — нічога ня хочацца. Ляжу, чытаю — помню толькі тады, як чытаю, назаўтра, мабыць, не расказала б. А пісьмы атрымліваць люблю і чакаю.

Дзякуй табе за весткі аб Багдановічу. Жалею я яго ўсё жыццё за такую раннюю смерць. А другога — Алеся Прушынскага. Ты ведаеш, у яго (у Алеся) была сястра Зюня (Юзэфа). Яна вышла замуж за ваеннага-паляка, калі яны былі ў Мінску, і выехала з ім. У яго яшчэ быў брат — Антось, хлапчук лет 13—14, хуліган, злодзей і г.д. Маці яго — прачка, жанчына змучаная жыццём, несімпатычная, жыла з гэтым Анцікам, а таксама і Алесь у кухні гэтага дому, а я — там, дзе Вы з мамай (у гэтым доўгім пакоі). Адтуль я з сваім татам пайшлі жыць к Русецкаму (Старажоўская, д.1). Пасля мы з Язэпам там пражылі лет 5, так жа, толькі ў другой кватэры, жыў таксама лет 4—5 і Якуб Колас. Калі рэдакцыю (пры немцах) закрылі, а мы пераехалі, дык у гэтым пакоі, дзе Вы жылі з мамай, яны сталі жыць, і Алесь там хварэў сыпняком, і мы з Яз.Ю. яго праведвалі. Гэта было ў 19 годзе. Вось бачыш — там бы можна прыбіць якую-небудзь «дошку» у чэсць Максіма і Алеся — ды ўжо таго дому няма і следу. А цэрква ж.-дар. (яе так называлі) стаяла ў 59 г. на месцы. І касцёл той чырвоны, помніш — толькі там быў нейкі радыё-клюб, ці што.

Ну вот табе і ўспаміны, але сумбурна і бесталкова. Разбірайся!

Цалую цябе, прывет тваім.
Ванда.

Надараласа, не толькі Ванда, але і Зоська Верас пра штось пыталася ў Ванды. Прынамсі, Зоська Верас папрасіла яе больш падрабязна, дэталёва расказаць ёй пра ратамскую навагодне-калядную вечарыну 1917 года, якую наведаў і Максім Багдановіч. Чаму пра гэту падзею папрасіла расказаць Ванду? Ванда жыла на тую пару ў Ратамцы і сама яе ладзіла. То як жа запомнілася тая ратамская калядная вечарына Вандзе, на якой быў і Максім Багдановіч?

22 лістапада

Дарагая Людачка!

У Ратамцы ставілі мы дзіцячую п'есу твайго перакладу з польскай. Загалоўка яе не памятаю. Пачыналася гэтак:

Авечкі мае! Ох, мая матка!
Адна ляжыць — дзе ж цэлая статка?
Уся ў крыві, ляжыць на зямлі —
А тыя дзе ж — яшчэ авечкі дзвё!

Змест гэтай п'ескі ты ўспомніш. Дзяўчынка-пастушка бяжыць у лес шукаць прапаўшых авечак, пападае да каралевы лесу (іграла гэту каралеву Жэня Маер, яе маці была ў нас тэхнічкай — няняй, у Маераў было чэцвера дзяцей — самы маленькі двухгадовы Юзік). Каралева (ці можа як іначай) за працавітасць дзяўчынкі аддае ёй авечак. Пяялі песні — «Чаму ж мне не пеиь». «Дуб да дуба пахіліўся» і др. вершы: Купалы — (пачатак ніяк не ўспомню) канец

Янка тутка, Янка тамка
Хоць ты ў пекла прыся —
А прыдзірак ад святых усіх
Колькі нацярпішся!

Каганца: «адважна, брацця, наперад»... Галубка: «Будоўля» — «Кіпіць работа, плыве пот, і стук, і грук, як гром»... Коласа — «У школу».

Здаецца, і ўсё, бо мы ставілі разам з другой школай — рускай, таксама дзяцей-уцекачоў. Дамоў мы вярнуліся і так позна. Я была дужа збянтэжаная: Жэню (каралеву лесу) мы дужа прыгожа адзелі, распусцілі ёй пышныя чорныя косы, адзелі вянок на галоўку, а забыліся.. асвяціць яе бэнгальскімі агнямі... Мне думалася, што ўвесь пасёлак ведае, што мы далі такога «маху». Села я дома і галаву звесіла, а Смоліч кажа: «Ныне отпущаеши, господи, раба твоего»...

Гэта было ўсе лет 50 таму, а мне здаецца, што я і цяпер бачу Смоліча і нашу маленькую комнатку, дзе мы спалі і займаліся з Ядзяй Раткевіч. Гэты пакойчык наш быў дужа халодны — ацяпляўся ён печкай-жалезкай. Звечара — горача, а раніцай вада замярзала. А вот хто яшчэ прыязджаў тады, апрача Смоліча, ніяк не ўспомню. Мо ты ведаеш?

Людачка, не трацься на пасылкі мне кніжак. У нас жа адзін пакойчык і цесна, а зрабіць якія-небудзь полкі на сцяне — таксама нельга. Маленькая этажэрка ўжо поўная...

Гэта прыязджала не дачка Талстога, а яго сястра, здаецца, Софія, не памятаю імені. Было гэта ў 1916 г. летам ці пад восень, бо яна была ў белым пікейным касцюме, хоць ужо пажылая. (Мы ўсе звярнулі на гэта ўвагу, таму і запомнілася). Была яна не прыгожая, не сімпатычная. У рэвалюцыю яна апынулася нейдзе за граніцай, і мне давялося ў нейкім рускім журнале чытаць даволі злосную «стацейку», дзе яе раўнялі з «жабай» — у яе вочы навыкат — яна прасіла «жертвовать на издания творчества брата Л.Н.Толстога». Яна «посетила» ў нас толькі сталовую — дзеці нашы і той школы абедалі разам.

Ну, на сёння хваціць, а што чуваць у Мінску? Выйшла кніжка Мядзёлкі, ня ведаеш? А ты выпісваеш беларускія газеты ці журналы? Цалую, прывет сям'і.

В.Л. 1965 г.
Татарка, Шпакоўскі р-н,
Стаўропальскі кр.

Зоська Верас вельмі турбавалася, каб Ванда мела хоць якое ўяўленне, што робіцца на Беларусі. У адным лісце да аўтара гэтай публікацыі яна пісала: «Ванда Л. з Менска не атрымлівала ніякай літаратуры... Сама яна не мела сродкаў, каб што выпісаць. Дачка, вучыцелька, зарабляла мала, а сына — ён інжынер — відаць, прасіць не хацела. Калі я напісала аб гэтым у Менск, мне адказалі: «Ваш ліст нас насмяшыў. Тут ідзе праца ў такіх маштабах, а ў Вас клопат аб нейкага аднаго чалавека: «Што тут смешнага — я так і не зразумела».

Вось гэтак даўнія сяброўкі, дзве з нашаніўскай пары адраджэнкі, раскіданыя злым лёсам на тысячы кіламетраў адна ад аднае, ліставаліся, размаўлялі між сабой, згадваючы даўно мінулыя дні і часы, падзеі, каштоўныя сваімі звесткамі не толькі для іх саміх, але і для нашае культуры, нашай гісторыі. Пакарыстаемася іхняй размовай належна.

Уладзімір СОДАЛЬ.

Замежжа

Замежжа

Новая маскоўская газета «Литературные вести» пра Беларусь і беларусаў

У палітыцы нельга «злёгку зацяжарыць...»

«Адыход ад улады двух з трох бацькоў «белавежскай змовы» зусім не наблізіў, як шмат хто спадзяваўся, рэінтэграцыю дзяржавы, што распалася. План аб'яднання Расіі ды Беларусі цераз агульную сістэму фінансаў праваліўся, бо сумяшчаць палітычны суверэнітэт з грашовай супольнасцю, высветлілася, гэтак жа нельга, як «злёгку зацяжарыць»... Але нейкая патавая сітуацыя захоўваецца і ў іх — на той жа Украіне, на той жа Беларусі. Тамтэйшыя камуністы, якія маюць ільвіную долю і ідэй, і ўлады, моцныя ў асноўным падтрымкай «рускамоўных» ды іншых «прасавецкіх» слаёў насельніцтва. Вынікае, вымушаныя так альбо інакш апеляваць да аб'яднаных ідэй. Але палохае іх нават не столькі гіпатэтычная неабходнасць зноў дзяліцца набытым (тут бы яшчэ здолелі дамовіцца як-небудзь), колькі сам вобраз новага гегемона, чыя дэмакратыя з мясцовай далечыні здаецца бязмежнай, тэмпы рэформаў — надзвычай высокімі...»

(№ 2, 1995)

Так паміналі Алеся Адамовіча ў Маскве

«Ён быў чалавекам, блізкім па духу Андрэю Сахараву. Быў і застаўся маральным арыенцірам грамадства, для прыстойнага жыцця якога сумленна, прыстойна працаваў. Гэта думка не аднойчы гучала ў перапоўненай зале ЦДЛ, дзе праходзіў вечар памяці Алеся Адамовіча, арганізаваны Саюзам пісьменнікаў Масквы. Пра А.М.Адамовіча — пісьменніка, кінадраматурга, вучонага, грамадзяніна — успаміналі пісьменнікі Л.Разгон і Т.Кузаўлева, В.Аскоцкі і А.Анфінагенаў, А.Гербер і А.Нуйкін, М.Каралаў, Л.Жухавіцкі, В.Савельеў, Л.Лазараў. Вёў вечар Ю.Чарнічэнка. У вечарыне ўзялі ўдзел прадстаўнікі адміністрацыі Прэзідэнта РФ — С.Красаўчанка, А.Суркоў, старшыня Камітэта па друку РФ С.Грызуноў, сябры Беларускага зямляцтва, госці з Мінска».

(№ 5, 1995).

Таццяна Кузаўлева: «Ня верце ім!» — крычала яго душа...»

«Ты цудоўная, Беларусь, але чаму злыя вятры ўвесь час дзьмуць у твой бок?» — гэтыя радкі з эпіграфа Алеся Адамовіча да аповесці «Венера, або Як я быў прыгоншчыкам», якая, здаецца, так і не была надрукаваная цалкам, — толькі раздзеламі, урыўкамі.

Злыя вятры... Яны білі ў сэрца Адамовіча з закатаванай і спаленай фашыстамі зямлі: білі з галодных ды халодных да- і пасляваенных беларускіх вёсак; білі з растрэльных нкусаўскіх ямін; білі з Чарнобыля. І моц іхняя часам здавалася невычэрпная.

— Ня верце ім! — пра злыя вятры крычала ягоная душа ці пра людзей, якія бласлаўлялі гэтыя вятры?

— Ня верце ім! — засцерагаў ён нас на VIII з'ездзе пісьменнікаў СССР, паказваючы на літаратурную наменклатуру ў прэзідыўме Вялікага Крамлёўскага Палаца. — Ня верце ім: яны адгарадзіліся ад нашых бедаў сваімі пісьмовымі сталамі і лецішчамі, сваімі прэміямі ды загранпаездкамі; яны занялі кругавую абарону і ніколі не пачуюць ні нашага абурэння, ні нашых слёз...

— Ня верце ім! — прагучала і на мінулагоднім судзе з нагоды захопу той жа ўчарашняй наменклатурай пісьменніцкіх правоў. — Ня верце ім!»

Гэта было яго апошняе выступленне. Апошняе заклінанне. Апошняя просьба, адрасаваная і суддзям, і нам, яго калегам. Такія людзі, як Алесь Адамовіч, заўжды нясуць у сабе боль, што не заглушыць, ад любой не справядлівасці. Ад прыгнятальнай напалавупраўды. Ад усяго, што мучае ды прыніжае чалавека...

(№ 6, 1995).

Гісторыя з геаграфіяй можа быць сумнай

«...Пытанне пра тое, ці характэрныя «зваротныя эфекты» для ўсенародных рэферэндумаў Беларусі, слаба вывучаны з прычыны недастатковай плебісцытнай практыкі гэтай незалежнай дзяржавы. Наступствы рашэння большасці тых, хто галасаваў, — умацоўваць сувязі з Расіяй па ўсіх напрамках і адвергнуць «нацыянальную» дзяржаўную сімволіку (у гістарычнай рэальнасці яна належала Вялікаму Княству Літоўскаму) на карысць «савецкай» (зараз пазбаўленай асноўных пралетарскіх атрыбутаў) — надзвычай неадназначныя...

І вось што яшчэ цікава: беларускаму прэзідэнту Аляксандру Лукашэнку, які ўсчаў усю гэту гісторыю з геаграфіяй, удалося паралізаваць прадстаўнічую ўладу рэспублікі без усялякіх хітрых штучак з урэзваннем партыйных квотаў (якіх, дарэчы, у мясцовым парламенце ніколі не існавала)...

Калі ж Беларусі і сапраўды наканавана стаць федэратыўным утварэннем у складзе Расіі, — такі ход упаўне лагічны пры нашых усемагутных губернатарах ды рэспубліканскіх прэзідэнтах з іхнімі кішэннымі заканадаўчымі сходамі, як бы тыя ні называліся»

(№ 8, 1995)

Ад рэдакцыі «Нашага слова»

Як бачыць чытач, новая пісьменніцкая газета Расіі «Литературные вести», першы нумар якой убачыў свет у студзені 1995 года, імкнецца да пільнага асвятлення падзей у Беларусі, да аб'ектыўнай адзнакі гэтых падзей і з'яў. Зразумела, згаданая газета — для літаратараў, якія любяць сваю Радзіму — Расію, яны зычаць свайму народу дабра, міру і дабрабыту... Але ж гэтыя людзі, што вельмі важна для беларусаў, па-першае, паважаюць нашу суверэннасць, наша права мець і развіваць сваю мову, па-другое, клапоцяцца, каб у вачах беларусаў, украінцаў, прыбалтаў і чэчэнцаў Расія выглядала не як імперскі монстр, а як дэмакратычная вялікая краіна, дастойная самай шчырай павагі іншых народаў. Такім чынам, «Литературные вести» — гэта не імперскае дэмакратычнае выданне. Не дзіва, што ў менскіх кіёсках яго няма. А тыя нумары «ЛВ», адкуль мы зрабілі вытрымкі з асобных публікацый, наш карэспандэнт атрымаў ад галоўнага рэдактара «Литературных вестей» Валянціна Аскоцкага ў Доме творчасці беларускіх пісьменнікаў «Іслач», дзе на днях адбыўся Другі міжнародны кангрэс у абарону дэмакратыі і культуры на тэму «Незалежная прэса: свабода і адказнасць».

У канцы кожнага нумара, як вядома, пазначаюцца прозвішчы не толькі галоўнага рэдактара, але і сяброў рэдакцыйнай калегіі. Дык вось, прозвішча Васіля Быкава тут стаіць поруч з яго цёзкам Васілём Аксёнавым, выдатным паэтам і бардам Булатам Акуджавай, публіцыстам Анатолем Прыстаўкіным, сатырыкам Аляксандрам Івановым, паэтэсай Бэлай Ахмадулінай і іншымі паважанымі дэмакратычнымі пісьменнікамі, якіх сёння называюць сумленнем і гонарам Расіі. З такой Расіяй нам па дарозе. Але з такой Расіяй ніколі не пажадаюць аб'яднацца нашыя самыя заўзятыя агітатары за інтэграцыю і русіфікацыю.

В Е Р У Е М

Спалучэнне беларускасці з уцаркоўленасцю...

З Іванам Аляксеевічам Чаротам, перакладчыкам, навукоўцам, гутарыць карэспандэнт «Нашага слова» Людміла Рублеўская

— Іван Аляксеевіч, у друку з'явілася інфармацыя, што пры Беларускім Экзархаце створана біблійная камісія і вы абраны яе сакратаром. Ці можна пагаварыць пра гэта падрабязней?

— Чаму ж не? Дзякуй за ўвагу да факту і да справы, якая за ім. А праз нашу з вамі гутарку ёсць нагода абвергнуць распаўсюджанае меркаванне, быццам бы Праваслаўная царква цураецца беларускай мовы. Каб у чытачоў «Нашага слова» складвалася што паўнейшае ўяўленне, пачну з фонавых звестак: родная мова гучыць у большасці менскіх храмаў, па-беларуску вядуць шэраг тэле- і радыёперадач праваслаўныя святары, выходзяць часопіс «Праваслаўе ў Беларусі і ў свеце», інфармацыйны-бюлетэнь «Ортапрэс», календары-кнігі, да таго ж і «Веснік Беларускага Экзархата», і газеты «Царкоўнае слова», «Епархіяльныя ведамасці» — не рускамоўныя. Асобнай гаворкі заслугоўваюць кнігі ды брашуры, якія выдаюцца Экзархатам і Праваслаўным Брацтвам Трох Віленскіх Мучанікаў... Хіба нейкая іншая канфесія мае штосьці падобнае?

Што ж да камісіі, дык яна стварылася не цяпер, існуе ўжо гады, і на пачатку працавала досыць актыўна, пра што сведчыць вынік — «Евангелле ад Матфея», на чатырох мовах, выдадзенае ў 1991 годзе. А цяпер, наколькі я разумею, узнікла патрэба ў абнаўленні яе складу і большай актывізацыі дзейнасці.

— Які ж новы склад?

— Па колькасці дванаццаць чалавек, узначальвае сам Уладыка Філарэт, намеснік яго — протаіерэй а. Георгій Латушка, у сакратарах — мая маленькасць, а ў актыве святары, багасловы, філолагі. Назваць імёны? Калі ласка, айцы Сергій Гардун, Георгій Сакалоў, Аляксандр Пачэпка, філолагі Алесь і Алена Яскевічы, Уладзімір Васілевіч, Валянціна Дышыневіч, выкладчык Духоўнай семінарыі Алесь Кароль, філосаф Мікола Матрунчык, гісторык і філолаг Таццяна Матрунчык, якая, дарэчы, укладала згаданыя вышэй календары, звод імёнаў святых...

І вось 6 верасня прайшло пасяджэнне, на якім разглядаліся арганізацыйныя пытанні, абмяркоўваўся план дзейнасці, а таксама вялася практычная праца над перакладам Евангелля ад Марка.

— А якім чынам ідзе праца?

— Працавалі саборна, ці як раней гаварылася, калектыўна. Уважліва, засяроджана, у грунтоўных дыскусіях выбіралася кожнае слова (падкрэсліваю: кожнае слова, кожны знак) Дабравесця, каб знайсці самы лепшы адпаведнік у роднай мове. А пры гэтым скарыстоўваўся і грэчаскі тэкст, і розныя пераклады на мовы свету.

— А ці патрэбна гэта, калі ўжо ёсць пераклад Васіля Сёмухі?

— Ёсць пераклады і Васіля Сяргеевіча Сёмухі, і Анатоля Канстанцінавіча Клышкі, і шэрагу іхніх папярэднікаў. Між тым, камісія ад пачатку ставіла (і цяпер яе трымаецца) задачу — пераклады рабіць непасрэдна дзеля ўнутрыцаркоўнага ўжытку.

— І вы лічыце, што патрэбны асаблівыя нейкія тэксты?

— Гэта не толькі і не столькі мая думка, а патрабаванне, як мы прывыклі казаць, аб'ектыўнае. Справа ж датычыцца не звычайных тэкстаў. Усе крытэрыі пераўвасаблення іх розняцца ад тых, якія прыдатныя ў адносінах да мастацкага перакладу. Заводзячы гаворку пра дакладнасць, мы на ўвазе павінны мець паўнату глыбіннага, сакральнага зместу. Калі вымагаем творчага падыходу, ні ў якім разе не зводзім яго да літаратурна-мастацкай творчасці ў традыцыйным разуменні. Хочам, каб знойдзены быў адпаведны стыль? А як жа, ды не сваёй воляю створаны, да Свяшчэннай першакрыніцы дададзены, прынесены...

Удакладню, што я тут не ацэньваў зробленае тымі высокапаважанымі калегамі, якіх мы называлі. Проста хацеў падвесці да меркавання: калі святары лічаць, што нейкі пераклад не зусім прыдатны, каб цалкам гучаць у богаслужэнні, трэба да гэтага прыслухоўвацца. Як-ніяк праваслаўная літургія на працягу года выкарыстоўвае поўны тэкст Чацвераевангелля. І калі Дабравесце прачытваецца, складваецца адпаведны настрой як агалошвання, так і ўспрымання. Тут важныя лад, стыль, інтанацыйны ключ, рытм і шмат іншага. Каб усё гэта было ў ідэале, дамагчыся вельмі і вельмі цяжка. Таму, даспадобы нам гэта ці не, галоўным і апошнім словам павінна быць слова тых, хто кіруецца не адцягненымі меркамі, а патрабаваннямі царкоўнай практыкі, — за святарамі.

— Выходзіць, за пераклад Святога Пісання чалавеку нецаркоўнаму брацца нельга?

— І так, і не так. Пра зробленае шаноўнымі калегамі Сёмухам і Клышкам я чуў шмат добрых слоў ад прадстаўнікоў царквы. А вось выкарыстоўванне іхніх перакладаў — іншая справа. Зрэшты, не ў маёй кампетэнцыі вызначаць, што можа ўжывацца ў богаслужэнні, а што не. Магу толькі звярнуць увагу на прыклады, свежыя па ўспрыманні асабістым. Перагортваючы «Службоўнік» Аўтакефальнай Беларускай Праваслаўнай Царквы, я, хоць і не надта ў багаслоўі дасведчаны, часта спатыкаюся на выразах многіх і многіх. Напрыклад: «Смерцяю смерць патаптаў», «Бог наш, Хто ўзлівае ласку Сваю», «Багародзіцы і ўвесь час Дзевы Марыі», ды і «хлеб наш штадзённы» мяне бянтэжыць, пра што ўжо даводзілася гаварыць на старонках «Нашага слова». Магу таксама засведчыць — і ад гэтага не варта адмахвацца, — што пры чытанні Евангелля па-беларуску большасць прыхажанаў у храме рэагуе адмоўна, а некаторыя нават пакідаюць храм у гэты час.

— Напэўна, яны не беларусы!..

— Ні ў пашпарт, ні ў душу я зазірнуць не мог. А наконт беларускасці з такога пункту гледжання магу таксама прывесці свежы (для мяне ўразлівы) прыклад. Вось якога характару: суполка з паслядоўнай шчырай беларускай арыентацыяй накіравала Мітрапаліту Філарэту ліст з просьбаю адслужыць паніхіду па продках, якія загінулі ў Грунвальдскай бітве. І каб паніхіда служылася па-беларуску. Подпісаў там было дзесяткі. Уладыка згадзіўся без ваганняў, благаславіў святара Кафедральнага сабора на гэтую службу. Ды... у сабор з'явілася ўсяго некалькі чалавек, і тыя не дачакаліся самой паніхіды. Хіба не цікавае спалучэнне беларускасці з уцаркоўленасцю?.. Але мы, відаць, адхіліліся.

— Пажадана, каб вы расказалі, што плануе зрабіць камісія.

— У планах — пераклад усяго Чацвераевангелля, поўнага тэксту Новага Запавету, а на далейшую перспектыву — усяго Святога Пісання. Акрамя таго, правядзенне канферэнцый, распрацоўка царкоўнаславянска-беларускага слоўніка багаслоўскай тэрміналогіі і рэлігійнай лексікі.

— Планы рэалістычныя?

— Думаю, так. Істотна, што трывалым грунтам дзеля гэтага сталі напрацоўкі Праваслаўнага Брацтва Трох Віленскіх Мучанікаў, якое даўно ўжо сабрала актыў руплівых працаўнікоў, назапасіла патрэбны матэрыял, сабрала профільную бібліятэку, набыла выдавецкія правы і сякія-такія магчымасці... Праўда, усё тут дзеецца толькі «на грамадскіх пачатках». Карыстаюся магчымасцю звярнуцца да ўсіх, хто здольны падтрымаць Брацтва: ахвяруйце на справы, бясспрэчна важныя!

— А ці збіраецца камісія прыцягваць яшчэ каго да супрацоўніцтва?

— А яна з самага пачатку запрашае да агульнай справы ўсіх, хто жадае быць карысным. Раней праводзіліся семінары, канферэнцыі з удзелам навукоўцаў розных профіляў, была сустрэча з творчай інтэлігенцыяй. Хутка, 5 кастрычніка, плануецца правядзенне сумеснага пасяджэння з секцыяй перакладу Саюза пісьменнікаў. Добра было б, каб падключылася Тэрміналагічная камісія ТБМ... Дарэчы, на гэтым пасяджэнні будзе абмяркоўвацца «Малебен за беларускі народ».

Плануе камісія абвясціць конкурсы на лепшыя пераклады акафістаў, жыцій. Але на гэта пакуль няма сродкаў... Упіраемся ў звыклае, цяжка вырашальнае.

— Але надзеі на лепшае ёсць?

— Як жа інакш?

— Ад імя газеты і чытачоў жадаем камісіі поспехаў.

— Дзякуй. І вам таксама. Каб усе мы як мага лепш працавалі на карысць Беларусі.

«Дарога па святых мясцінах — шляхам Ефрасінні Полацкай з Непагаснай Лампадай Духоўнасці» — гэтак называецца навукова-творчая экспедыцыя, якая праходзіла на мінулым тыдні. Маршрут яе пралягаў праз Менск, Полацак, Быхаў, Рэчыцу і Тураў.

Галоўная мэта экспедыцыі — наведванне старажытных цэнтраў беларускае гісторыі, культуры і духоўнага жыцця. У часе экспедыцыі прайшла навукова-творчая канферэнцыя «Асветнікі зямлі беларускае».

На здымку: Захоўнік Непагаснай Лампады Духоўнасці айцец Сергій перадае Святы Агонь ад гроба Гасподняга прадстаўнікам рэчыцкага духавенства.

Фота Віктара ТАЛОЧКІ, Белінфарм.

Беларускае праваслаўе

(Да візіту Патрыярха Алексія II у Беларусь)

Праграма прадугледжвала наведванне Патрыярхам трох з дзесяці беларускіх епархіяў: Менскай, Гарадзенскай і Берасцейскай, дзе шмат каталікоў. А таму лагічна меркаваць, што адна з асноўных мэтаў паездкі — гарманізацыя адносін паміж БПЦ і каталіцкім касцёлам.

Кідаецца ў вочы, што Патрыярх не зрабіў ніякіх дзеянняў, якія маглі б палічыць за падтрымку прыхільнікаў стварэння ў Беларусі праваслаўнай палітычнай партыі і ператварэння БПЦ у дзяржаўную царкву, нідзе не абмовіўся дзеля падтрымкі якіх-небудзь формаў палітычнага ўціску на каталікоў і пратэстантаў.

Падчас прыёму Патрыярха А.Лукашэнка заявіў аб сваёй падтрымцы праваслаўя як «духоўнай асновы беларускай нацыі» і аб гатоўнасці прадоўжыць падтрымку БПЦ з боку дзяржавы.

Патрыярх не падтрымаў намеру прэзідэнта, а таму можна сцвярджаць, што ў адносінах паміж А.Лукашэнкам і РПЦ існуюць пэўныя складанасці, а Алексій II і Філарэт знаходзяцца адносна свецкай улады ў Беларусі на адным баку. Пакуль прэзідэнту Беларусі падначаліць царкву свайму ўплыву не ўдаецца.

У Расіі адначасова з узмацненнем чырвона-карычневых адбываецца паглыбленне ўнутраных супярэчнасцяў сярод царкоўнай іерархіі. Узмацняюцца пазіцыі прыхільнікаў Мітрапаліта Пецярбургскага Іаана ды іншых, што выступаюць за больш актыўную палітычную ролю царквы, за супрацьдзеянне канфесійным канкурэнтам палітычнымі метадамі.

Перад візітам Патрыярха ў Беларусь на Маскоўскім сінодзе РПЦ упершыню супярэчнасці паміж іерархамі перашкодзілі прыняццю некаторых рашэнняў, за якія выступаў і сам Алексій.

Над курсам Патрыярха Алексія — тыя ж хмары, што і над курсам мітрапаліта Філарэта, і тыя ж сілы — расійскія нацыянал-патрыёты — патрабуюць ад іх палітызацыі царквы і яе актыўнага ўдзелу на сваім баку ў палітычнай барацьбе.

Калі гэта сапраўды так, то не будзе перабольшваннем сказаць, што візіт Алексія II у Беларусь быў выкліканы ўціскам з боку гэтых палітычных сіл, здольных папракнуць яго за недастатковы клопат аб абароне праваслаўя ў Рэспубліцы Беларусь. А таксама — імкненнем атрымаць падтрымку з боку больш-менш адзінага і магутнага беларускага праваслаўнага святарства ў барацьбе з сваімі ўнутранымі і знешнімі супраціўнікамі ў Маскве.

(Аўтар артыкула згадвае пра намеры ўладаў Расіі і Беларусі актыўна заступіцца за праваслаўную царкву і ўвесці жорсткія абмежаванні, надзейнасць не праваслаўных канфесій, задае пытанні, чаму Алексій і Філарэт не схільныя прыняць гэтыя дары.) Праблема ў тым, што царква яшчэ не гатова прыняць на сябе місію ідэалагічнага ведамства. Большыня царкоўных абшчынаў у Расіі і ва ўсходняй Беларусі толькі-толькі створана. Вернікі толькі пачалі знаёміцца з асновамі абрадаў, не кажучы ўжо пра асновы веры. Святары, як правіла, не адукаваныя або адукаваныя не адпаведна, бо не было магчымасцяў падрыхтаваць святароў прыкладна для 8 тысяч новых прыходаў РПЦ, якія з'явіліся пасля 1988 года.

У такіх умовах царква, калі яна стане інстытутам дзяржаўнай улады, як таго хочуць некаторыя свецкія палітыкі, проста стане заложніцай палітычнай каньюнктуры ў ахопленай эканамічным і палітычным крызісам краіне. Прычым, усе ўдары супраціўнікаў уладнай групоўкі ў выпадку злучэння царквы з дзяржавай будуць накіраваны і супраць царквы. А гэтымі ўдарамі могуць стаць, прыкладам, стымуляцыя росту неправаслаўных канфесіяў або спрыянне ўнутраным расколам у самой РПЦ. Ад царквы пачнуць адыходзіць тыя людзі, якія шукаюць у ёй веру і прытулак ад мірскіх (чытай: палітычных) жарсцяў, гэта значыць тыя, хто складае аснову любой царкоўнай арганізацыі.

(Працяг будзе.)

Скарочаны пераклад артыкула Ю.Шаўцова з газеты «Белорусский рынок».

ВУЧЫМСЯ

Скалечаныя жыцці

1945 год. Беларусь, спакваля залечваючы раны, думала і пра сваю будучыню. У 1945 годзе ў першыя класы пайшлі дзеці, якія выйшлі з чатырохгадовай вайны. Увайну ж, вядома, ніхто з іх не вучыўся. У школах было шмат перарасткаў. Скажам, у класе, у які хадзіў і я, вучыліся тыя, хто нарадзіўся ў 1934—1938 гадах. Што гэта была за вучоба — цяпер можа не кожны паверыць, што так было. На ўвесь клас — адзін буквар. Настаўніца ставіла ўсіх нас у кружок — ў нас і партаў на тую пару не было, і самой школы не было, сабралі нас у выпадкова ацалелай хаце. Дык вось — паставіла нас настаўніца ў кружок і да кожнага з разгорнутай кнігай падходзіць. Пакажа якую-кольвек літару, — скажам «а» — і просіць яе запомніць. Мы, гледзячы на тую літару, паўтараем яе тры разы: «А-а-а...» Гэтак спазнавалі першыя азы навукі. Асабліва нам усім, без выключэння, цяжка давалася расійская мова. Не, яна не была нам зусім чужая, але ж не была такая блізкая, як роднáя. Чытаць нібы і чытаеш ды не вельмі разумееш, што чытаеш. Гэтае чытанне хіба можна параўнаць, калі б, скажам, нашым людзям даць першы раз у рукі кніжку на балгарскай мове. У такой кніжцы нібыта і ўсе літары знаёмыя, і словы страчаюцца зразумелыя, але чытанне не вельмі ідзе. Вось гэтак пачувалі і мы, першыя пасляваенныя першакласнікі, калі нам патрапілі кніжкі на расійскай мове. Яны, паўтаруся, былі для нас не зусім чужыя, але і не свае, не такія блізкія, родныя, як той буквар ці чытанка з словамі «раніца, рукавіца, вуліца, курыца». Ад іх вееяла якімсь холадам, паўночным зззяннем. Холад гэты ішоў не толькі з літар, не толькі з шрыфтоў, знешняга ўспрыняцця друкаваных старонак, але і з духу і зместу тых кніжак — нават малюнкаў. І гэта не выпадкова. У тых кніжках расказвалася, распавядалася пра жыццё нам невядомае ці малавядомае. Але не на гэтым я хачу засяродзіць увагу. Усялякая навука ёсць навука — на роднай мове ці на якой іншай — яна заўсёды вымагае працы, напружання, волі. Але ж павінна пры такой вучобе ўлічвацца і іншае. Да нас жа, беларускіх дзяцей, змэнчаных вайной — галодных, халодных, абдзёртых, безбацькавічаў былі да ведаў па расійскай мове такія ж патрабаванні, як да маскоўскіх дзяцей: пяць-шэсць памылак — і двойка. Шмат хто з нас па расійскай мове не паспявалі, не спраўляліся. Нам кожны год давалася праца на лета. Цэлае лета кожны год мы спісвалі па некалькі сшыткаў, каб як-небудзь патрапіць у наступны клас. З горам папалам нас таксяк давялі ўсіх да пятага класа. А пятых класаў у нашай школе было аж тры. То з гэтых трох пятых у шосты клас патрапіла не больш як з дзесяткі два вучняў. Усіх жа астатніх пакінулі на другі год. І пераважную большасць за непаспяховасць менавіта па расійскай мове. Гэта якраз і была трагедыя для ўсіх, пакінутых на другі год. Амаль ніхто з іх не скончыў сярэдняй школы. Ледзь-ледзь па сем-восем класаў неяк дабілі — на тым і завяршылі сваю навуку. Я таксама быў сярод пакінутых на другі год у пятым класе. І вядома ж — за расійскую мову ці больш дакладна — за няўцямнасць расійскай граматыкі. Трэба, скажам, пісаць дый гаварыць «который», а мне здавалася, што па-расійску больш правільна — «которий». Ведама ж, дзе я тую расійскую мову чуў. Але з мною праз усё жыццё жыў мой Анёл, і мяне з клопату настаўніцы фізкультуры і згоды дырэктара з другагоднага пятага класа перавялі ў шосты. Настаўніца фізкультуры, прозвішча Логінава, зайшоўшы ў другагодны пяты клас, прыгадала, што я вучыўся не горш за тых, каго папера водзілі, і мяне з пятага класа пасадзілі ў шосты. Я гэтак і пайшоў далей да дзесятага, без другагодніцтва. А ўсе астатнія сярэдняй адукацыі не атрымалі. Адпаведна склалася іхняе жыццё. Хто спіўся, хто збэсціўся, хто ў турмы пайшоў, хто на тым узроўні жыцця і застаўся. Не развіліся ў асобу, не адчулі сябе грамадзянамі. Педагагічная затурканасць не дала ім падняцца, хоць былі сярод іх і здольныя. І мова іхняя сталася калечаная, і душы ж такія ж знявечаныя. Яны гавораць не **толькі**, а **тока**, не **колькі**, а **скока**... **Відал, віджу**... І шмат чаго іншага вылятае з паблытаных галоў нязвыклага ні для беларускага, ні расійскага вуха. Што ж да мяне, то я і цяпер адчуваю той моўны гвалт, усю жорсткасць тых суровых патрабаванняў да нас, абяздоленых вайною дзяцей. Мне і цяпер сняцца пакутлівыя экзамены, летнія заданні па расійскай мове — так гэта ўсё цяжка нам далося. Я і цяпер адчуваю сябе недавучаным, хоць усё жыццё прагну ведаў, спазнання. І вышэйшую адукацыю атрымаў выпадкова: зноў жа паспрыяў мне мой Анёл. Вядома, за гэтым Анёлам стаіць пэўная постаць, для якой найважнейшым ад мяне была не коска, а мая чалавечая сутнасць. Усё ж астатняе нажыўное. І коска, і кропка, і ўся граматыка. Калі б не Ён, не гэты Анёл, я б ніколі з сваёй школьнай падрыхтоўкай, з сваім веданнем расійскай мовы не патрапіў бы ў вышэйшую навучальную ўстанову. Гэта ўжо пазней пачалі дазваляць здаваць экзамены на Беларусі па мове на выбар, а нам ваенным і пасляваенным, даводзілася здаваць абедзве мовы, і з гэтай нагоды для многіх з нас дарога да навукі была закрыта — і найперш усё праз яе — хоць і блізкую, але не зусім родную мову.

Усе гэта згадалася менавіта зараз не выпадкова. Моўнае невуцтва на Беларусі працягваецца, набывае новыя формы. Можа мой лёс, лёс тысяч такіх, як я, што вучыліся ў маю пару ды не давучыліся праз непасільныя да нас патрабаванні па расійскай мове — усе ж яна нам тады не была родная, — змусяць сённяшніх авангардыстаў хоць на хвілінку задумацца. І гэта таксама будзе добра. Нарэшце, хай гэтыя згадкі стануцца фактам беларускай педагогікі, хай упішуцца ў гісторыю беларускай педагогікі, як для нас, пасляваенных, гаротных, галодных, абдзёртых беларускіх дзяцей, былі такія ж патрабаванні па расійскай мове, як і да расійскіх, з-за чаго шмат якім беларускім дзецям было пакалечана жыццё. Пра гэта таксама трэба ведаць, перш чым прымаць якіясь не вельмі абдуманыя рашэнні.

Уладзімір СОДАЛЬ.
Жлобіншчына, вёска Мормаль.

ACADEMIA «NS»

Гісторыя моваў на Беларусі

Уладзімір СВЯЖЫНСКІ,
кандыдат філалагічных навук

Беларуская мова

(Працяг.)

«Многія выпадкі піджынізацыі і наступнай крэалізацыі моў схаваныя ад нас у глыбіні стагоддзяў».

Міхаіл Дзьячкоў. Піджынізацыя і крэалізацыя як сацыялінгвістычныя працэсы.

Як разумеліся ў Вялікім Княстве

(Заканчэнне.)

Мова-піджын — разнавіднасць змешанай мовы, якая ўзнікае ў выніку неабходнасці зносін на разнамоўнай тэрыторыі. Першапачаткова англ. спалучэнне pidgin English называлі «дзелавую» (pidgin з busines — справа), гранічна спрошчаную мову, якая самаадвольна ўзнікла ў портах Паўднёвага Кітая ў якасці дапаможнага сродку зносін. Яго лексіка — англійская, звычайна скажоная ў фанетычным плане і семантычна (nusi-pepa — кніга, пісьмо з newspaper), граматыка — кітайская. Сацыяльны прэстыж і матэрыяльны субстрат піджына не ідзе ні ў якое параўнанне з прэстыжам і багаццем паўнацэннай (роднай ці імпартаванай) мовы. **Піджынам называюць рэдукаваную дапаможную мову, якая выконвае сітуацыйна абмежаваныя камунікатыўныя функцыі і не з'яўляецца роднай ні для кога з тых, хто на ёй гаворыць.**

Дзелавым, гандлёвым па сферы ўзнікнення і прымянення піджынам была так званая кяхцінская або кітайскай (г. Кяхта на мяжы Расіі і Кітая), або кітайская гаворка рускай мовы. Аснова гэтай гаворкі — расійская мова з гранічна спрошчанай (на кітайскі манер) граматыкай — без скланення і спражэння слоў. Да кяхцінскага піджына звярталіся кітайскія гандляры гарадка Маймачэнь (побач з Кяхтай) і рускія «от взаимного незнания языков».

Падобныя піджын, праўда, на іншай аснове (расійска-нарвежскай), быў ва ўжытку ў паўночных пераўраў — расійцаў і нервежцаў (ён носіць назву «ruska-norsk» (рюска-ношк)), яго лексіка — сумесь расійскіх, нарвежскіх, нямецкіх і англійскіх слоў. У вялікай колькасці піджыны як другасныя мовы міжэтнічных зносін узнікалі ў буйных гарадах-портах Міжземнага мора, у гарадах Афрыкі, Амерыкі, на астравах Ямайка, Гаіці. Мовамі-крыніцамі піджынаў часцей за ўсё аказваліся еўрапейскія мовы, мовамі-субстратамі — мовы мясцовых этнасаў. На Беларусі тэндэнцыі да ўзнікнення моўных утварэнняў накшталт піджынаў маглі ўзнікаць у зонах славяна-балцкага памежжа, а таксама ў зносінах з ганзейскімі купцамі ў Полацку, Рызе і на Гоцкім беразе, першапачаткова ў зносінах з татарамі і іншымі этнічнымі меншасцямі краю, пакуль тыя не авалодалі беларускай мовай.

Крэольская мова. Піджын мае толькі сацыяльны субстрат (кантынгент носьбітаў, звязаны з гандлем, урбанізацыяй, міграцыяй), але не мае этнічнага, г.зн. ні для аднаго народа ён не з'яўляецца родным — **крэольская мова, насупраць, мае ў першую чаргу этнічны субстрат у асобе новага этнаса, які фарміруецца ў выніку дзеяння пэўнага этнічнага працэсу — інтэграцыі, этнатрансфармацыйнай кансалідацыі або міксацыі (аб'яднання) этнасаў**.

Крэольская мова — гэта ў прынцыпе паўнацэнная мова, якая мае ў сваім распараджэнні багатую лексіку, самастойна выпрацаваную граматыку, здольная развівацца па сваіх унутраных законах падобна любой натуральнай мове. Крэольская мова пачынае свой шлях з піджына і паступова перарастае ў самастойную, хаця і другасную ў структурных адносінах мову. Піджын ніколі не бывае роднай мовай, ён заўсёды толькі неабходнае дапаўненне да яе; крэольская можа стаць і становіцца роднай (часцей за ўсё ў другім пакаленні асоб, якія карысталіся піджынам) і выконвае ва ўмовах этнічнай стракатасці і разнамоўнасці функцыі агульнай, надэтнічнай і нават міжэтнічнай мовы. Агульны лік носьбітаў крэольскіх моў у цяперашні час пастаянна расце. Асноўнымі з'яўляюцца крэольскія мовы, якія сфарміраваліся з англамоўных, франкамоўных, іспанамоўных і партугаламоўных піджынаў. У старажытнасці ўмовы для крэалізацыі беларускай мовы ўзніклі ў выніку працяглага і інтэнсіўнага ўздзеяння польскай мовы пры цесным суіснаванні двух этнасаў. Асобныя польскія элементы замацоўваліся ў беларускай мове ў якасці нормы, з цягам часу колькасць такіх элементаў узрастала. Асабліва ярка канвергенцыя беларускай і польскай моў відаць на прыкладзе польска-беларускай семантычнай інтэрферэнцыі, калі з-за немагчымасці лексічнага запазычвання ў выніку наяўнасці ў беларускай мове слова такога ж утварэння, адбываецца семантычнае запазычванне — спрадвечнае слова пачынае ўжывацца ў значэнні яго польскага міжмоўнага амоніма. Такіх выпадкаў у старабеларускай пісьменнасці, калі ўласнабеларускае слова ўжываецца ў нязвыклым для яго значэнні, даволі многа. Вось некаторыя з іх: **беглый** «умелы» (польск. biegły), **выбити** «пабіць» (польск. wybic), **забечи** «перашкодзіць» (польск. zabiec), **заживати** «адчуваць» (польск. zażywać) **запирати** «адракацца» (польск. zapierać), **зволочи** «затрымаць» (польск. zwlec), **карати** «павучаць» (польск. karać), **общий** «чужы» (польск. obcy), **острый** «строгі, суровы» (польск. ostry), **отнести** «адчуць» (польск. odnieść), **поднести** «узняць» (польск. podnieść), **росказати** «загадаць» (польск. rozkazać) і інш. У наяўнасці тэндэнцыя ўзнікнення на аснове змяшэння дзвюх моў нейкай трэцяй, якая сумяшчае ў сабе семантыку той і другой. У наш час цеснае суіснаванне беларускай і расійскай моў ва ўмовах змяшэння двух этнасаў стварае ўмовы для новага этапа крэалізацыі беларускай мовы цяпер ужо пры дапамозе расійскай мовы. *Замацаванне* ў беларускай мове ў якасці нормы ўсе большай колькасці элементаў расійскай мовы на лексічным і граматычным узроўнях прыводзіць да ўзнікнення трэцяй — беларуска-расійскай крэалізаванай мовы. Крэалізацыя закранае нават ужо такі высокаарганізаваны ўзровень беларускай мовы, як фанетыка. Прынамсі, зараз прэтэндуе на статус нормы неадлюстраванне ў вымаўленні такога важнейшага элемента беларускага вымаўлення, як асімілятыўная мяккасць зычных. Недысімілятыўнае вымаўленне груп зычных пераважае ў электронных сродках масавай інфармацыі, якія, як вядома, з'яўляюцца найбольш прэстыжнымі, аўтарытэтнымі карыстальнікамі нацыянальнай мовы. У многім гэтаму садзейнічала русіфікацыя беларускага правапісу ў выніку рэформы 1933 года.

Культура мовы

Вядома, што правапіс у беларускай мове пазычанняў з класічных моваў складае зараз цэлы шэраг праблемаў. Прыкладам — спрэчкі наконт выбару нормы маўлення старажытнагрэцкіх словаў пры іх напісанні ў нашым тэксце (гл. «Беларуская лінгвістыка». Вып. 33. Жураўскі А.І. Фрынас ці Трэнас). Але, здаецца, не меншы разнабой заўважаны і ў выкарыстанні саміх назваў класічных моваў — старажытнагрэцкай і лацінскай. Перш чым дасягнуць згоды ў арфаграфіі пазычанняў, варта разабрацца са слушнасцю або не ўжывання варыянтаў: «латынь», «лаціна», «грэчаская», «грэцкая» мова.

Неадпаведнасць тэрміну *«грэчаская» мова* і вытворных ад яго нормаў сучаснай беларускай мовы, яе культуры дастаткова добра паказаў П.Сцяцко ў публікацыі ў часопісе «Роднае слова». Аднак, амаль паўсюль у тэкстах пануе ўсё тая ж *«грэчаская» мова*. Хутка, мабыць, дапішамся да выразаў кшталту «каталічаская царква».

Але калі штучнасць прыметніка «грэчаскі» збольшага навідавоку, то варыянтнасць «латынь» («лаціна»), «лятынь» заслугоўвае пільнейшага разгляду.

Фактычна адзінкавым ёсць напісанне «лятынь» («з другога боку, антычныя вучэньні перадаваліся праз лятынамоўную схаластычную традыцыю». Vieda. Мн. — 93. С.52). Як бачым, такая перадача — гэта прыстасаванне да тарашкевіцы варыянта «латынь».

Часцей зараз сутыкаемся з менавіта напісаннем «латынь» (напр. «А як што Кнэхта хвалілі не толькі за поспехі ў латыні і добры нораў, але асабліва яго зарэкамендаваў настаўнік музыкі». *Г.Гесэ. Гульня шкляных перлаў. Мн. — 1992. С. 46*, ці «...Гусоўскі вывучыў мову тагачаснай заходнееўрапейскай культуры — латынь». *Гісторыя Беларускай літаратуры. Старажытны перыяд. Мн. — 1985. Ст. 141.*

Слова «лаціна» ўжываецца радзей, але падаецца адзінапрымальным, на мой погляд, з наступных прычын.

У адрозненне ад варыянта «латынь», які з'яўляецца пазнейшым пазычаннем праз расійскую мову-пасрэдніцу, слова «лаціна» — запазычанне прамое (latina — лацінская мова) і больш старажытнае, пра што сведчыць яго поўная адаптацыя да фанетыка-марфалагічнага ладу нашай мовы. Так, у помніку старабеларускага пісьменства «Хроніцы ВКЛ і Жамойцкага» чытаем: «Ай межи слугами которие при нем были, был еден гречин научоный и **по-лацинѣ** и **по-грецку**» (ПСРЛ. т. 32. М. — 1972. С. 111). Думаю, цяжка казаць пра нейкі моцны ўплыў польскай мовы ў той час на старабеларускую, бо ёсць аматары прыпісваць ледзь не ўсе пазычанні да польскай або расійскай моваў-пасрэдніц. Калі ж нехта сумняваецца ў «беларускасці» апошняга варыянта напісання, звернемся да сучасных класікаў. Ул.Караткевіч, якога цяжка дакараць у дрэннай мове, у рамане «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» піша: «А пра важлівае можна і па-лаціне; Ён гаварыў і гаварыў, з асалодаю адчуваючы, як тонка, зусім не па-кухоннаму гучыць залатая лаціна, як грацыёзна рухаюцца пальцы па краях скруткаў».

Такім чынам, варыянт «лаціна» трэба прызнаць традыцыйным, як сведчаць помнікі пісьменства, і адпаведным сучасным патрабаванням культуры мовы. Нельга прымусіць усіх пісаць «грэцкая мова» і «лаціна», але спадзяюся, што гэтыя заўвагі дапамогуць зразумець штучнасць іншых напісанняў.

Антось КУЗЬМІЧ.

Дарэчы

Дык што такое нацыяналізм?

Шмат хто зараз на гэтае пытанне можа адказаць: нацыяналізм — завышэнне адной нацыі над іншымі, альбо пагардлівае стаўленне да нейкай нацыі. Але ці так гэта? Сапраўды, як вядома, супраць нацыяналізму выступаюць прыхільнікі камуністычнае філасофіі. Возьмем іхні «Философский словарь» (М., 1981). Чытаем: «**нацыяналізм** — адзін з прынцыпаў буржуазнае ідэалогіі і палітыкі, які заключаецца ў пропаведзі нацыянальнае адасобленасці і выключнасці, міжнацыянальнай варожасці і недаверу да іншых *нацыяў*... Перадаючы характар узаемаадносінаў нацыяў пры капіталізме, Н. выступае тут у дзвюх формах: вялікадзяржаўнага шавінізму пануючае нацыі, якому ўласцівыя зняважлівыя адносіны да іншых нацыяў, і мясцовага Н. прыгнечанай нацыі, які розніцца імкненнем да нацыянальнае замкнёнасці і недаверу да іншых нацыяў... Н. у любой форме непрымальны для працоўных, сапраўдныя інтарэсы якіх перадае толькі пралетарскі, сацыялістычны інтэрнацыяналізм...» (С. 239). Далей адзначаецца, што камуністы на пэўным «гістарычным этапе» лічаць гістарычна апраўданай падтрымку нацыяналізму прыгнечанае нацыі, ён мае ў сабе «агульнадэмакратычны змест». Тут ідзе гаворка аб антыімперыялістычнай накіраванасці, імкненні да эканамічнай і палітычнай незалежнасці. Далей гаворыцца пра існаванне адмоўнага боку такога нацыяналізму: выражэнне ідэалогіі і інтарэсаў «рэакцыйнай эксплуататарскай вярхушкі», якая мае схільнасць да «згодніцтва з імперыялізмам». Падкрэсліваецца, што такі бок непрымальны для камуністаў; што нацыяналізм як рыса светапогляду мае распаўсюджанасць у «дробнабуржуазным асяроддзі» і д.т.п. У выніку нацыяналізм называецца «пережыткам мінуўшчыны».

Возьмем выд*анне: The encyclopedia of philosophy. Volume five. New York—London, 1967.* Тут падаецца пяць значэнняў слова **nationalism** (нацыяналізм). Першае — пачуццё адданасці нацыі (від патрыятызму); другое — гэта схільнасць абмяркоўваць інтарэсы толькі сваёй нацыі, асабліва ў выпадку канкурэнцыі з інтарэсамі іншых нацыяў. У трэцім значэнні — пазіцыя, што надае вялікую важнасць адрозненню характэрных рысаў нацыяў. Чацвёртае — дактрына, якая сцвярджае, што нацыянальная культура павінна захоўвацца. У пятым значэнні нацыяналізм — палітычная і антрапалагічная тэорыя, паводле якой чалавецтва па прыродзе падзелена на нацыі. Тут існуюць крытэрыі для ўстанаўлення нацыі і для прызнання яе прадстаўнікоў. Кожная нацыя мае права на сваё незалежнае кіраванне, і дзяржавы легітымныя ў выпадку адпаведнасці гэтым прынцыпам. Свет быў бы справядліва арганізаваны толькі тады, калі б кожная нацыя прыняла форму адзінай дзяржавы, а кожная дзяржава мела б толькі адну нацыю.

Ідэю нацыяналізму абараняе С.Дубавец («Падставы рацыянальнага нацыяналізму»// ЛіМ. 1990, № 44). Тут аўтар даводзіць: «За межамі камуністычнае ідэалогіі нацыяналізмам называюць нацыянальную свядомасць. Нацыяналіст — носьбіт гэтае свядомасці». С.Дубавец падкрэслівае падмену паняццяў. Сапраўды, такая падмена адбываецца, калі чалавека вінавацяць за тое, што ён нацыяналіст. Тут неабходна заўсёды тлумачыць, што мы нацыяналісты ў станоўчым сэнсе гэтага слова. Мы — нацыянал-патрыёты. Наш нацыяналізм не дапускае завышэння беларускай ці нейкай іншай нацыі. Мы можам гаварыць пра славутых беларусаў (Ф.Скарына, К.Семяновіч, А.Т.Касцюшка, А.Міцкевіч, М.Глінка, М.Агінскі, С.Манюшка, Янка Купала, В.Быкаў...). Пры гэтым мы адзначаем, якое значэнне ў гісторыі маюць славутыя сыны нашае Бацькаўшчыны. Мэта — абуджэнне пачуцця нацыянальнага гонару. Але, калі мы ганарымся сабою — гэта не значыць, што мы фанабэрыста глядзім на іншых.

Проста мы сцвярджаем: шануючы чужое, шануй і сваё. Тут можна сапраўды гаварыць аб тым, што нам, беларусам, характэрны нацыяналізм прыгнечанай нацыі. Мы не столькі былі незалежныя, колькі залежныя. Мне даводзілася чуць думку: нацыяналізм — гіпертрафіраваныя адносіны да нацыі. Маўляў, нічога дрэннага і нічога добрага. Але беларускаму народу на дадзеным этапе неабходнае нацыяналістычнае выхаванне ў процівагу нацыянальнаму нігілізму.

Сёння шмат каму вядомыя словы Ф.Скарыны: «Понеже от прирожения звери, ходящие в пустыни, знають ямы своя; птици, летающие по возъдуху, ведають гнезда своя; рибы, плавающие по морю и в реках, чують виры своя; пчелы и тым подобная боронять ульев своих, — тако ж и люди, игде зродилися и ускормлены суть по бозе, к тому месту великую ласку имають» (з прадмовы да кнігі «Иудиф — вдовици»).

Дык што гэта? Вядома ж, патрыятызм. Адсюль развіваецца нацыянальная свядомасць, носьбіт якой і ёсць нацыяналіст.

Калі ж гаварыць аб беларускіх філосафах-нацыяналістах, дык іх у нас багата. У К.Каліноўскага была «Мужыцкая праўда», у Ф.Багушэвіча — «Дудка беларуская», «Смык беларускі»; у Цёткі — «Скрыпка беларуская». Тут мы бачым эстэтычную філасофію нацыяналізму. Калі Якуб Колас — паэт глыбока нацыянальны, дык Янка Купала — глыбока нацыяналістычны. Першы стварыў «Новую зямлю» як твор, які перадае нацыянальнае жыццё (тут канцэпцыя жыцця і чалавека). Другі ўзняў праблематыку выжывання беларускай нацыі. Беларусы ў Купалы ідуць «людзьмі звацца» («А хто там ідзе», 1905—1907). У Коласа: «Я — мужык, бядак пахілы...» У Купалы: «Я мужык-**беларус**...» Успомнім — колькі Купала «плакаў» за Беларусь. Вядома ж, і Якуб Колас паказаў свой нацыяналізм:

Нас падзялілі! — Хто? Чужаніцы!
Цёмных дарог махляры.
К чорту іх межы, к д'яблу граніцы!
Нашы тут гоні, бары!

Можна ўспомніць М.Багдановіча, Алеся Гаруна, Ігната Абдзіраловіча... А Б.Тарашкевіч наогул з'яўляецца прыкладам камуніста-нацыяналіста. Не дзіва, што яго знішчылі. Да філасофіі нацыяналізму трэба аднесці і публікацыі ў прэсе шмат якіх патрыётаў Беларусі. Сёння мы бачым постаці такіх бацькоў нашага адраджэння, як Ніл Гілевіч, Зянон Пазьняк, Васіль Быкаў... Дарэмна антыбеларускія сілы іх спрабуюць цкаваць за нацыяналізм. Зноў і зноў гаворым пра падмену паняццяў.

Генадзь КАЖАМЯКІН.

Урэшце

Музыка вышэйшая за логіку

Едруся Акуліна ведаюць на Беларусі як барда. Яго песні ўзнёслыя, лірычныя, вельмі паэтычныя... А што ж такое Едрусь Акулін-паэт?

Перагартаем старонкі апошняга зборніка паэта-барда, які называецца «Крыло анёла» (Мастацкая літаратура, 1995 г.). Што перш за ўсё заўважым? Музыку вершаў. І тут можна было б паразважаць над узаемаадносінамі ўласна вершаў і тэкстаў для песень. Дзе між імі мяжа? Па якіх крытэрыях можна сцвердзіць, што тэкст вось гэтай песні ёсць сапраўдны верш, а гэты тэкст застаецца ўсё-ткі толькі тэкстам? Радкі, пазбаўленыя музычнага суправаджэння і голасу выканаўцы, робяцца безабароннымі — прыкутыя да раўнадушнай белай паперы, яны адкрытыя погляду чытача з усімі сваімі хібамі і недахопамі.

Вось, напрыклад, верш — ён жа цудоўная песня — «На беразе»:

Сарамліва ў люстэрка ракі
Ты сама на сябе паглядзела,..
І каса** паслухмяна **з рукі
Мілавіцай асыпала цела.

Нелагічна? Так... Але... Чытаючы — чуеш музыку, і яна замяняе логіку вобраза, таму што, далібог, музыка вышэйшая за логіку... Вось тым вершам, у якіх музыкі менш, не заўсёды ўдаецца апраўдаць эксцэнтрычнасць вобраза, калі «след ад слязы на твары — гравюра на нечы лёс», ці калі паэт марыць быць смыкам, які зайграе на віяланчэлі — аголенай жанчыне... Але — зноў жа — музыка ёсць, бо ёсць музыка. Што заўважна яшчэ, дык тое, што аўтар хоча менавіта не бардаўскай, а прафесійна-паэтычнай славы, так, што прагаворваецца:

Мае вершы сумуюць па кнізе...
Ім нясцерпна апрыкла бадзянне
па газетна-зімовай адлізе
з правам дзённага лёсайснавання...

Е.Акулін, сцвярджаючы сябе як паэта-прафесіянала, піша ў самых розных рэдкіх паэтычных формах. У зборніку ёсць ронда, трыялеты, тэрцыны, актава, туюгі, віланэль, рытурнэль, элегія, канцона, газэля, вольны верш, нарэшце — акрапаэма... Дарэчы, у апошняй Е.Акулін знайшоў цікавы ход — акрапаэма пабудаваная па ўзору вянка санетаў, дзе ў якасці кароннага санета выкарыстаны знакаміты верш Максіма Багдановіча «Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...» Прыемна дапісваць класікаў... Паэт (які, дарэчы, павінен быць паэтам, і не жадаючы гэтага) звяртаецца не толькі да традыцыйных формаў, але і традыцыйных тэмаў. У многіх досыць маладых паэтаў ёсць вершы — уласныя эпітафіі, дзе аўтары інструктуюць чытача, як іх трэба будзе пахаваць. Помніцца, адзін з нашых паэтаў жадаў, каб яго закапалі на раздарожжы, другі прасіў не ставіць на магіле помнік, а толькі камень з Пагоняй... Былі і інакшыя, больш квацістыя, фантазіі. Едрусь Акулін вылучыўся: ён просіць яго цела затапіць у Бесядзі, прычым абавязкова галавой супраць плыні. Пэўна, нашчадкам, якія будуць выконваць паэтаву волю, давядзецца прывязваць да цела пару-другую камянёў... Затое клопату сапраўды мала — ні ямы капаць, ні на помнік траціцца... Праўда, паэт спадзяецца, што яго самоту на дне падзеліць пекная русалка... Мусіць, гэта спрацоўвае паэтава падсвядомасць — бо з усіх вершаў Едруся вынікае, што яго стыхія — вада. Скрозь у радках — дождж, залева, навальніца. Паэт прызнаецца, што быў закаханы ў раку. Усё ў яго ўяўленні плыве, сплывае, аплывае... Ён нават марыць абудзіць у якасці залевы раллю. Можа быць, таму любімыя паэтавы поры года — дажджлівыя восень і вясна?

Па прачытанні кнігі застаецца адчуванне пяшчоты, трапяткасці радкоў... А яшчэ — прыстойнасці, чысціні пачуццяў. А гэта нечага вартае. Можа быць, нават усяе паэзіі.

Літаратнік.

Збіраем матэрыялы для «Крыўскай» (Беларускай) міфалагічнай энцыклапедыі

Баян. У крыўскай (беларускай) міфалогіі Баян — боства абрадавых спеваў і музыкі. Мае адпаведнікаў у міфалогіях іншых народаў, прыкладам, — Арфея ў старажытнагрэцкай... Этымалогія ягонага імя звязана з дзеясловам «баяць».

Пакуль жа пра Баяна можна прачытаць... у «Міфалагічным слоўніку», што ён, эпічны паэт-спявак, вядомы з «Слова пра паход Ігаравы»: «**Баян бо** вещий, аще кому хотяше песнь **творити**, то растекашеся мыслию по **древу**, серым вълком по **земли, шизым** орлом под **облакы**». Поводле гэтай часткі паэмы аўтары слоўнікавага артыкула робяць выснову, што ў Баянавых песнях адбілася «шаманская традыцыя, звязаная з уяўленнем пра сусветнае дрэва, і навыкі ранняй славянскай паэзіі, якая ішла ад агульнаіндаеўрапейскай паэтычнай мовы».

Вядомы М.Г.Булахаў, аўтар Кароткага энцыклапедычнага слоўніка «Слова пра паход Ігаравы» ў літаратуры, мастацтве, навуцы», схільны лічыць Баяна гістарычнай асобай — жыў, як мяркуюць, у другой палове XI — пачатку XII стагоддзя. М.Г.Булахаў згадвае таксама, што Баян у «Слове...» названы Велесавым унукам, што Карамзін падаваў яго за старажытнарускага (не расійскага — **З.С**) паэта, што скептыкі не лічаць Баяна гістарычнай асобай.

Як бачым, даследніку, які будзе пісаць пра Баяна, прыйдзецца вырашыць некалькі важных пытанняў. Перш — вызначыць: Баян прыдуманы ці ён — сапраўдны міфічны герой. Ягонае радство з «рэальнай» асобай — Велесам (як памятаеце, да гэтага часу беларусы ладзяць свята, што называецца Уласе) дае падставу сцвярджаць даўняе міфалагічнае паходжанне Баяна. Вядома ж, культ Велеса, бога-апекуна свойскай жывёлы, не мог існаваць без адпаведных абрадаў, без спеваў і музыкі.

Такая «гістарычнасць» Баяна вытрымае крытыку скептыкаў, а таксама і «допыт» тых навукоўцаў, якія мяркуюць, што «Слова пра паход Ігаравы» напісана не ў XII, а ў XVIII стагоддзі. Ды як там ні было, а даўні ці нядаўні аўтар не выдумаў у сваёй манаскай келіі Баяна, а толькі меў за ўзор «рэальнага» прататыпа — Велесавага ўнука.

Трэба будзе таксама пераканацца, што не мог быць ім (прататыпам) Баян — гістарычная асоба, скажам, жыхар Кіева. Вядомы ж, прыкладам, запіс (калі гэта не падробка) на сцяне Сафійскага сабора пра куплю ўдавою князя Усевалада зямлі нейкага Баяна. Асоба з такім жа імем згадваецца і ноўгарадскім летапісцам. Баян мог жыць і ў Менску. Прынамсі, так сцвярджаў наш славуты паэт, публіцыст і краязнаўца Людвік Кандратовіч (Уладзіслаў Сыракомля), які, дарэчы, быў перакананы, што «Слова пра паход Ігаравы» напісана на беларускай мове.

З.СІЦЬКА.

«Аршанскай бітвы» не было

(Працяг. Пачатак на с.2.)

ся, і, спрытна сабраўшы інструменты, металісты разам са сваімі фэнамі пагрузіліся ў аўтобус. Здавалася, што Крапівенскае поле і фэст засталіся ў руках беларусаў старога ўзору. Пасля перапынку на імправізаванай сцэне пачаўся канцэрт бардаўскай песні.

Творы самадзейных аўтараў вызначаліся непадабенствам — ад сучаснага ўзору агітбрыгады — студэнцкага тэатра «Жывое слова» да выкананых «пад фанеру» надзвычай патрыятычных і бязглуздых песень кшталту «белчырвона-белае хлеб і віно», ад толькі што напісаных у Оршы расійскіх рамансаў да беларускіх падробак пад савецкую эстраду 60-х гадоў. Былі, праўда, і іншыя выканаўцы: Андрэй Мельнікаў з песнямі на словы галіцыйскіх паэтаў, Алесь Камоцкі, які, дзякуй Богу, парушыў дадзенае год таму абяцанне кінуць спяваць, Алег Мізула, выступленне якога стала падзеяй фестывалю і сапраўдным адкрыццём новай зоркі бардаўскай песні. Але здзіўляла тое, што, праспяваўшы дзве-тры песні, барды сыходзілі са сцэны і ўжо не вярталіся. Як аказалася, імі кіраваў усё той жа вядучы канцэрта, жадаючы хутчэй прапусціць бардаў, каб вызваліць сцэну для чарговай рок-каманды — сталічнай «Саркастык грын», якая, дарэчы, з'явілася таксама без запрашэння. Каб ашчадзіць час, кагосьці са спевакоў проста не пусцілі на сцэну. Сярод іх аказаўся і Зміцер Бартосік — адзін з тых, хто сваёй творчасцю стварае аблічча беларускай бардаўскай песні. Пакрыўдзіўшыся, той узяў гітару пад паху і сярод ночы пайшоў на аршанскі вакзал, да якога было 15 кіламетраў.

На сцэну выйшлі менскія рокеры, павітаўшы прысутных заклікам «Няхай жыве і пасецца беларуская птушка лось!». Гэтая фраза спустошыла беларускі лексікон саліста, які ўслед за сваімі папярэднікамі заспяваў па-англійску. Але праз нядоўгі час здарылася нечаканае: святло на сцэне і па ўсім навакольлі згасла, і песня, у якой праз слова згадвалася імя прэзідэнта Ірака, абарвалася на паўслове.

Каб працягнуць фэст, рокерам не хапала электрычнасці, бардам — настрою. Гэта быў канец.

Паняцце «беларуская песня» можна тлумачыць па-рознаму. У адной трактоўцы гэта будзе разумецца як частка песеннай культуры беларускага народа, у другой — як твор чалавека, які жыве на тэрыторыі Беларусі. Менавіта апошняга ўзору песенькі часцей за ўсё гучалі ля Крапіўны. Подзіву гэта не выклікае: сёння большасць моладзі, ды і ўсяго грамадства, мала цікавіцца беларушчынай. Тыя ж, для каго словы «грамадзянін Беларусі» не проста запіс у пашпарце, а нешта большае, застаюцца меншасцю. Але ж гэтыя людзі здолелі на працягу некалькіх гадоў праводзіць песеннае свята, форму і аблічча якога выбралі яны самі. Чаму так не адбылося гэтым разам? Каб адказаць на гэтае пытанне, трэба прыгадаць, з чаго ўсё пачалося. Чатыры гады таму аршанскі паэт і гітарыст Андрэй Мельнікаў на гадавіну бітвы пад Оршай запрасіў туды сваіх знаёмых — бардаў і не толькі — з розных куткоў краіны. Імправізаваны канцэрт бардаўскай песні, які тады адбыўся, і лічыцца першым фэстам «Аршанская бітва». У розныя гады ён выглядаў па-рознаму: была і вандроўка шляхам войска гетмана Астрожскага, і выступленні сапраўдных зорак беларускай аўтарскай песні — такіх, як Віктар Шалкевіч ці сам Мельнікаў, была прысяга сяброў БЗВ на вернасць краю, было ўсталяванне на месцы падзеяў памятнага камяня. Фэст ведалі не толькі на радзіме, але і ў беларускіх асяродках Польшчы, Летувы, іншых краін...

У гэтым годзе паміж арганізатарамі фэсту ўзніклі непаразуменні. Невядома, што стала іх прычынай, але Андрэй Мельнікаў — чалавек, які даў святу імя і ствараў яго вобраз, у падрыхтоўцы яго гэтым разам не ўдзельнічаў. За справу ўзяліся двое: старшыня Аршанскай гарадской рады ТБМ Алесь Шутаў і журналіст гарадской газеты Юры Копцік. Кіраваліся яны жаданнем надаць фэсту найбольшы размах ці якім іншым, але пачалі з пошукаў не выканаўцаў, а фундатараў. У кожнай іншай краіне адзіны нацыянальны фестываль бардаўскай песні быў бы падтрыманы ўрадам. Але на Беларусі, дзе пануюць людзі са свядомасцю «малодшага брата», разлічваць на гэта не выпадала. Таму арганізатары вырашылі звярнуцца па падтрымку ў недзяржаўную структуру — Беларускі фонд Сораса, тым больш, што адной з мэтаў яго маладзёжнай праграмы названа нацыянальна-культурнае адраджэнне. У фонд накіравалі заяву на атрыманне гранта, падпісаную Алесем Шутавым, але, як ні дзіўна, пра нацыянальны характар фэсту там не было нават згадкі. У дадатак змянілася яго назва — «Аршанская бітва» ператварылася ў сціплы «Чацвёрты фестываль беларускай маладзёжнай песні». Думаю, прычына гэтых зменаў застанецца асабістай таямніцай старшыні ТБМ Оршы, бо, як паведамілі мне ў фондзе Сораса, яго супрацоўнікі не абумоўлівалі і не абмяжоўвалі ні нацыянальнай, ні моўнай яго канцэпцыі, ні складу ўдзельнікаў. Гэта было справай арганізатараў, якія пазней і прадаставілі беларусам іхняе сціплае месца.

Фестываль фондам быў падтрыманы — на рахунак Аршанскай гарадской Рады ТБМ паступіла 1000 долараў, якімі распарадзіліся арганізатары фэсту. На што гэтыя грошы пайшлі? «Не бачу тут ні баксаў, ні беларусаў» — не надта карэктнае, але трапнае акрэсленне становішча на фестывалі пачуў я ад аднаго з яго ўдзельнікаў.

Што можна дадаць да гэтых словаў? Прычына, з якой фэст ператварыўся ў тусоўку, простая: атрымаўшы выпадковыя грошы, выпадковыя арганізатары запрасілі на чужое свята такіх жа, як і самі, выпадковых гасцей. Дагэтуль «Аршанскую бітву» падтрымлівалі не грошы — іх проста не было, — а духоўная еднасць людзей, што збіраліся на Крапівенскім полі. Гэтым разам іх месца занялі іншыя. Што будзе наступным?

У.ПАНАДА.

КАЛЫХАНКА

Словы Васіля РАГАЎЦОВА
Музыка МІКОЛЫ ЯЦКОВА



Засынай, мая заранка,
Люлі-люлі —
Засынай.
І збудзіся росным ранкам
Развясененай, як май.
Прыпеў: Хай спяваюць калыханку
Пераліўна салаўі.
Хай пільнуюць сон да ранку
Месяц з ночкаю ўдваіх.

Засынай, мой коцік, люлі,
Люлі-люлі —
Засынай.
Краскі ўсе даўно паснулі,
Толькі ты не спіш адна.
Прыпеў.

Засынай, мая заранка,
Люлі-люлі —
Засынай.
І збудзіся росным ранкам
Развясененай, як май.
Прыпеў.

Шэдэўры нашай архітэктуры



Камянецкі замак



Час узнікнення горада Камянца дакладна не вызначаны. Верагодна, ён равеснік Бярэсця, які згадваецца ў летапісах пад 1019 годам. З тых жа крыніцаў вядома, што ў XIII стагоддзі, прыблізна паміж 1276 і 1288 гадамі, у «градзе» на рацэ Лясной была вымуравана вежа. Драўляны Камянецкі замак быў разбураны яшчэ ў XVI стагоддзі, а вежа захавалася — узвышаецца над высокім берагам ракі Лясной.

Вежа стаіць на падмурку каля двух з палавінай метраў. Яе вышыня — 30 метраў, таўшчыня сценаў — два з палавінай, вонкавы дыяметр — трынаццаць з палавінай метраў. Вежавыя сцены маюць байніцы. У першым і чацвёртым ярусах — па дзве, на другім і трэцім — па тры, на пятым — чатыры (адна з іх — на фотаздымку).

У сцяне, пачынаючыся ад трэцяга яруса, ідзе лесвіца на верх вежы, на баявую пляцоўку, прыкрытую 14 зубцамі.

Камянецкая вежа была непрыступнай для тагачаснай абложнай тэхнікі. Абаронцы ж маглі з вышыні страляць з арбалетаў. Вежы такога тыпу (іх называюць «данжонамі») стаялі ў Вярэсці, Тураве, Полацку, Гародні, Навагарадку ды іншых беларускіх гарадах.

Рэканструкцыю Камянецкага замка, паводле даследаванняў Міхася Ткачова, зрабіў мастак Яўген Кулік. З ягонай калекцыі паходзяць і фотаздымкі Камянецкай вежы.





Святочны каляндар беларусаў

Дзесяты месяц года, які атрымаў назву ад «золата» Беларусі — льну, дакладней ад кастрыцы (у гэты час трапалі і часалі лён, ад якога выпадала кастра). Яго характэрныя прыкметы: «Плача халоднымі слязьмі», «Красавік багаты вадою, а кастрычнік — півам»; «Кастрычнік ні калёс, ні палоззяў не любіць»; «У кастрычніку сем надвор'яў на двары: сее, вее, муціць, круціць, раве, зверху лье, знізу мяце»; «Верасень пахне яблыкамі, а кастрычнік капустай»; «Гром у кастрычніку — зіма бясснежная»; «Кастрычнік ходзіць па краю і гоніць птушак з гаю»; «У кастрычніку на адной гадзіне і дождж і снег».

У кастрычніку паўсюдна пачыналася Вялікая вясельніца (пара вяселляў), якая працягвалася і ў наступным месяцы — аж да Піліпаўкі. Галоўным святам кастрычніка былі Пакровы (Пакравы), якія лічыліся апошняй мяжой восені.

1 (нядзеля). **Ун**. *Пакроў Найсвяцейшае Багародзіцы.*

7 (субота). **Кат**. *Маці Божай Ружанцовай.*

7—14 кастрычніка. Народны каляндар. Гэты тыдзень на Мядзельшчыне называўся «бабіным летам», якое ад вераснёўскага адрознівалася тым, што не было звязана з працай, а насіла сямейны характар. Магчыма, раней яно адзначалася на вялікай тэрыторыі. У гэты час загадвалі на выключна важную асобу ў сямейным жыцці — шчаслівую бабулю-павітуху або «пупарэзніцу». Кожнай з такіх вядомых спрактыкаваных у прыняцці родаў бабуль «раздаваліся» дні гэтага тыдня. Калі дзень выдаваўся ціхі, сонечны, вясёлы, лічылася, што роды будуць лёгкія, дзіця будзе здаровае, ціхае, вясёлае і будзе мець шчаслівы лёс. Звычайна ў гэтыя дні стаяла іменна такое надвор'е, што і ўмацоўвала сямейны аптымізм.

9 (панядзелак). **Прав**. *Спачын апостала і евангеліста Івана Багаслова.* Святому прыпісвалася аўтарства «Евангелля ад Іаана».

Народны каляндар. *Іван Журавінавы* або *Кураед, Пакроўны і Шаптун.* Апошняя назва мае той сэнс, што свацці ў гэты дзень сакрэтна шапталіся з жаніхамі, хадзілі «ў пярэпыты», каб наладзіць сватанне і вяселле: «Іван Шаптун сватоў разаслаў, каб да Пакрова была дзеўка гатова». Ёсць нават восеньская песня:

Ах, восень, восень,
Сватоў па восем,
А да мяне ніводнага!
Ах, восень, макрота,
Хлопцам жаніцца ахвота.

Акрамя таго, што такія восеньскія песні нясуць адпаведны пары года сум, усё ж у іх гучаць вясельныя, шлюбныя матывы, а часам нават званочкі пад вясельнай дугой:

— Ой, восень мая сцюдзёная,
Чаго так рана настала?
— Я й не раненька, я й не позненька —
Калі мая пара прыйшла.
Лісточак упаў, зямельку пакрыў —
Вось мая й пара прыйшла.
— Чаму, Гануля маладзенькая,
Так рана замуж пайшла?
— Я й не раненька, я й не позненька —
Як мая пара прыйшла.
Татулька аддае, сужанька бярэ —
Вось мая й пара прыйшла.

Азначэнне прысвятка *«Журавінавы»* сведчыць, што ў гэты час хадзілі па журавіны. У прыказцы «Хто не дасее да Івана Багаслова, той не варты добрага слова» зафіксавана яшчэ адна хрысціянізаваная назва гэтага свята. У гэты дзень вернікі неслі курэй папам — адсюль і такая назва прысвятка — «Кураед».

11 (серада). **Народны каляндар**. *Пакроўны бацька* — прысвятак перад Пакровамі. Асобна адзначаліся ў суботу перад Пакровамі *Дзяды* — сёлета яны з гэтым святам супадаюць.

14 (субота). **Прав**. *Пакроў Найсвяцейшае Багародзіцы.*

Народны каляндар. *Пакровы, Пакрова, Трэцяя Прачыстая.* Народнае разуменне свята адлюстравалася ў прыказках: «Прыйшлі Пакровы і пытаюць, ці да зімы гатовы»; «На Пакрове дай сена карове»; «Пакровы — пастухоўскія кіі на дровы»; «Прыйшла Пакрова — раве дзеўка, бы карова». У адной з гэтых прыказак раскрыта народнае разуменне паняцця «пакрыцця»: «Святы Пакроў накрыў зямлю жоўтым лісцем, маладым сняжком, ваду лёдам, пчалу мёдам». У валачобнай песні гэтае паняцце раскрыта яшчэ больш шырока:

Святы Пакроў пытаецца
Ды ва Ўздзвіжанькі:
— Ці ўзышло ў полі жыта?
Ці ўруніла ў полі жыта?
А я буду хадзіці, аглядаці,
Зямлю лістам засыпаці,
Снегам чыстым пакрываці,
Ваду лёдам, пчолку мёдам надзяляці,
старых бабак кіёчкамі,

«Кастрычнік зямлю балоціць, лес залоціць, а жыта малоціць»

Сярэдніх жанчын — світачкамі,
А дзяўчатак наміткамі пакрываці.

З Пакроваў моладзь ладзіла вячоркі, дзе хатняя праца спалучалася з песнямі, гульнямі, танцамі, дзе расказваліся казкі, паданні, былічкі, дзе ствараліся будучыя сем'і. У дзень Пакроваў дзяўчаты, што хочуць выйсці замуж, ставяць свечку перад іконамі і просяць: «Святы Пакроў! Пакрыў ты зямлю, пакрыў і ваду, пакрый ты і мяне маладу! Пакроў-Багародзіца! Пакрый мяне, дзяўчыначку, сваёй святою пакровачкай ісці на чужую староначку!» Народны сэнс свята гучыць у песні:

Вось Пакрова прыйшла,
Перамену прынясла:
Як не лісцем, то снегам
Яна зямельку пакрыла.
Як рупліва працавалі,
Каб Пакрову так гулялі.

15 (нядзеля). **Ун**. *Нядзеля айцоў Сёмага Сабора (Другога Нікейскага).*

Народны каляндар. 14—21 кастрычніка Дзявоцкае лета (падаўжэнне «Бабінага лета», калі дні размяркоўваліся паміж дзяўчатамі, і па надвор'ю гэтых дзён меркавалі, якая з кожнай дзяўчыны атрымаецца жонка — добрая ці дрэнная.

28 (субота). **Прав., ун**. *Дзяды (Бацькоўская, Дзмітраўская памінальная субота).*

31 (чацвер). **Народны каляндар**. *Лука (Лукаш)* — прысвятак сялянскіх іканапісцаў. Лічыўся неспрыяльным для сяўбы азімых: «Хто не сее да Лукі, той не будзе мець ні хлеба, ні мукі». Заканчвалася пара вяселляў. «На Лукаша дзеўка наша».

Вядуць: народны каляндар — Васіль ЛІЦВІНКА; царкоўны каляндар — Ірына КРЭНЬ.

Прэса-куламеса

Што муж зрабіў з паліцыяй?

«Муж **звярнуіся** і паліцыю з нагоды знікнення сваёй жонкі».

«Звязда».

Адкрываем новыя імёны

«28 лютага — «Пішу я, бо плача сэрца». Да 105-х угодкаў з дня нараджэння К.**Свяяна**».

«Добры вечар».

Дывыд дык Дывыд...

«Першымі кандыдатамі тады стануць Вітаўт Вялікі, **Дывыд** Гарадзенскі, Стэфан Баторы».

«Свабода».

Зусім азвярэлі...

«Я **бычыў**, як амонавец ударыў дубінкаю па сьпіне школьніка і штурхнуў яго ў бок аўтобуса».

«Свабода».

Якасць іх дзяцей — таксама дзелавая якасць!

«Я паважаю законы дзяржавы, прызнаю яе вышэйшых асоб, але і ў мяне ёсць права ацэньваць іх дзяцей і дзелавыя якасці», — падкрэсліў Генадзь Бураўкін».

«Літаратура і мастацтва».

(Па сцвярджэнні рэдакцыі «ЛіМа», замест слова «дзяцей» павінна было стаяць «дзейнасць» — рэд.)

Заснавальнік: ТБМ імя Ф.Скарыны.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220029, г.Менск, вул.Чычэрына, 1. Тэлефон: 33-17-83.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Эрнэст Ялугін — галоўны рэдактар, Лявон Баршчэўскі, Янка Брыль, Анатоль Бутэвіч, Вінцук Вячорка, Віктар Гайсёнак, Радзім Гарэцкі, Ніл Гілевіч, Аляксей Глушко, Сяргей Запрудскі, Анатоль Клышка, Уладзімір Ламека, Зміцер Санько, Яўген Цумараў, Генадзь Цыхун, Віктар Шніп. Адказны сакратар Здзіслаў Сіцька.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за дакладнасць фактаў і іншых звестак. Пункт гледжання аўтара можа не адпавядаць меркаванню рэдакцыі. Рукапісаў рэдакцыя не рэцэнзуе і назад не вяртае.

Індэкс 63865. Замова 3995

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». 220041, г.Менск, пр.Ф.Скарыны, 79.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Наклад 3999 паасобнікаў.
Падпісана ў друк 25.09.1995 г.
у 15 гадзін.